


УРАЖАННІ ПАСЛЯ СХОДУ 2-5

ПРЫПРАВЫ ЗАМЕСТ ЛЕКАЎ 9



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 КРАСАВІКА 2024 г. СУБОТА № 84 (30218)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ПЯРЦОЎ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«На ліквідацыю наступстваў усяго комплексу Чарнобыльскай аварыі ўжо патрачана, паводле даволі сціплых падлікаў, больш як $19 млрд. І тут у комплексе, напэўна, варта разглядаць і рэабілітацыю зямель — зямель паўднёвых, урадлівых, Гомельскай, Брэсцкай і Магілёўскай абласцей; і сацыяльную дапамогу людзям, якія пацярпелі ад гэтай аварыі, медыцынскую рэабілітацыю, лячэнне, аздараўленне і выплаты; дапамогу людзям, якія сёння жывуць на гэтых тэрыторыях... Гэта не проста памяць аб той даце. Гэта рэальна каласальная работа, якая праводзіцца ў нашай дзяржаве, якой удзяляе ўвагу кіраўнік дзяржавы».*

# З пазыўным «Лідар»



Фота БелТА.

**Яўген Старадуб з пазыўным «Лідар» працуе на пасадзе начальніка дзяжурнай змены пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада ў Магілёве. Ён актыўны ўдзельнік конкурсаў, якія штогод ладзяцца ў МНС.**

**Найбольш дзейснымі для яго сталі спаборніцтвы на найлепшага ратавальніка-вышынніка. У мінулым годзе ў барацьбе за лідарства заняў трэцяе месца, а ў гэтым сярод 36 удзельнікаў здолеў завяваць першае.**

## КОРАТКА

- **Апублікаваны зацверджаныя УНС Канцэпцыя нацбяспекі і Ваенная дактрына.**
- У Беларусі з 25 красавіка пачаліся выплаты матэрыяльнай падтрымкі ветэранам, былым вязням фашызму, членам сем'яў загінулых у гады вайны ваеннаслужачых.
- **Прысвечаны Дню Перамогі адзіны ўрок пройдзе ва ўсіх школах Беларусі 7—8 мая.**
- Пералікі відаў дзейнасці ІП апублікуюць для абмеркавання 15 мая.
- **Сезон атракцыёнаў і фантанаў адкрыўся ў Мінску.**

На слыху

# ЯКОЕ ЯНО, ШКОЛЬНАЕ МЕНЮ?



Фота Лізаветы ГОПАД.

Падчас абеду ў сталовай гімназіі № 13 г. Мінска.

**Ежа для дзяцей павінна быць смачнай ці карыснай? Сёння, калі вывелі агульную формулу школьнага грамадскага харчавання, так адназначна пытанне ўжо не ставіцца — харчаванне школьнікаў павінна быць і смачным, і карысным, і збалансаваным.**

Летась у Беларусі стартаваў пілотны праект па арганізацыі школьнага харчавання. Нядаўна на нарадзе пад старшынствам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Рамана Галоўчанкі падводзілі папярэднія вынікі рэалізацыі гэтага праекта.

СТАР. 7

Прыклад для пераймання

# ШТО ЗА ТАЕМНЫМІ ДЗВЯРЫМА?

## Як вясковы тэатр, створаны бацюшкам, дапамагае знайсці шлях да Бога

**У храм у гонар святога Дзімітрыя Салунскага прыхода Раства Прасвятой Багародзіцы, што ў вёсцы Старое Сяло, я прыехала загадзя: там якраз ішла служба. Прыемна было ўбачыць на ёй шмат дзяцей: ад немаўлят, якіх маладыя мамы трымалі на руках, да падлеткаў. Маю ўвагу адразу ж прыцягнула дзяўчынка ў яркай вязанай шапачцы, якая падавала прыхаджанам цеплату (запіўку) пасля прычасця. Як высветлілася, гэта дачка святара Агнія. Яна, дарэчы, яшчэ спявае на кліросе, а ў велікодным спектаклі, на рэпетыцыю якога я і прыехала, будзе іграць ролю Бураціны.**

СТАР. 8



Тата Карла бласлаўляе Бураціну ў школу.

ISSN 1990 — 763X
24084
9 771990 763008

# «У НАШЫХ СІЛАХ ЗАХАВАЦЬ МІР, НАШУ РЭСПУБЛІКУ БЕЛАРУСЬ»

## Дэлегаты і госці УНС — аб асноўных пасылах кіраўніка дзяржавы і ўражаннях пасля Сходу

**Сёмы Усебеларускі народны сход, несумненна, ужо ўвайшоў у гісторыю суверэннай Беларусі. У першы дзень яго работы ў новым, канстытуцыйным, статусе Прэзідэнт Беларусі быў выбраны Старшынёй УНС. Таксама дэлегаты выбралі намесніка Старшыні, членаў Прэзідыума. Аляксандр Лукашэнка выступіў з дакладам, у якім падрабязна расказаў аб ролі і месцы Усебеларускага народнага сходу ў абноўленай палітычнай сістэме дзяржавы, сацыяльна-эканамічных дасягненнях Беларусі за гады незалежнасці, праінфармаваў аб абстаноўцы ў свеце і вакол нашай краіны. Падчас другога дня УНС дэлегаты прынялі найважнейшыя стратэгічныя дакументы нашай краіны — Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі і Ваенную дактрыну Рэспублікі Беларусь.**

**У завяршэнні сёмага Усебеларускага народнага сходу яго Старшыня, Аляксандр Лукашэнка, параіў дэлегатам не спрабаваць ацэньваць сваю работу цяпер. У гэтым кантэксце кіраўнік дзяржавы лічыць трапнай фразу старшыні Белтэлерадыёкампаніі Івана Эйсманта — «вялікае бачыцца на адлегласці», а таму прапанаваў трошкі пачакаць, каб потым даць справядлівую ацэнку таго вялікага шляху, які і дэлегаты УНС, і ўвесь беларускі народ мае намер прайсці. Грамадства яшчэ доўга будзе абмяркоўваць заявы, якія прагучалі на VII Усебеларускім народным сходзе, прынятыя на ім рашэнні. Дэлегатам і гасцям гэтай найважнейшай падзеі трэба будзе іх трансліраваць людзям. А пакуль яны дзеляцца сваімі меркаваннямі з карэспандэнтамі «Звязды».**

Ігар ЛУЦКІ:

### «Мы акрэслілі абрысы новай палітычнай рэчаіснасці»



**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Ігар ЛУЦКІ** падкрэсліў, што канстытуцыйны статус надае рашэнням УНС абавязковы характар для выканання ўсімі дзяржаўнымі органамі і грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Пацвярджэнне таму — прыняцце Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны, найважнейшых дакументаў. «Вялікае бачыцца на адлегласці, але і сёння мы акрэслілі абрысы новай палітычнай рэчаіснасці. Мы разам прынялі найважнейшыя рашэнні па пытаннях бяспекі нашай дзяржавы. Але для забеспячэння бяспекі мы павінны быць самі мабілізаваныя, каб унутры краіны ўсё было спакойна. Калі ў краіне будзе спакой, калі кожны на сваім месцы будзе адказна выконваць сваю справу — то і знешнія пагрозы будуць слабець. Але гэта не значыць, што яны знікнуць. Таму ўмацаванне арміі, умацаванне абараназдольнасці, выкананне свайго грамадзянскага абавязку — вось што павінна стаць галоўным вынікам Усебеларускага народнага сходу», — падкрэсліў ён.

Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ:

### «Адзінства лідараў Беларусі і Расіі, як і згуртаванасць дэлегатаў УНС, — гэта прыклад для ўсіх»

**Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** выказаў упэўненасць: для сістэмы адносін Беларусі і Расіі было вельмі важна, што падчас УНС неаднаразова падкрэсліваўся саюзніцкі характар адносін дзвюх краін. «У другі дзень Усебеларускага народнага сходу акцэнт быў зроблены на абаронны кампанент, на забеспячэнне бяспекі Беларусі і Расіі як дзвюх дзяржаў, аб'яднаных Саюзным дагаворам. А ў першы дзень мы пачулі ад Прэзідэнта маштабную ацэнку саюза Беларусі і Расіі. Дадаць да гэтага толькі змястоўную работу, выкананне прынятых раней рашэнняў, у тым ліку студзеньскага пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета, дзе былі падпісаны 16 грунтоўных дакументаў, — сказаў дзяржсакратар. — Адказ на ідэалагічныя, інфармацыйныя пагрозы звонку — аб'яднанне людзей, грамадстваў Беларусі і Расіі вакол нацыянальных лідараў. Гэта вельмі важна. Згуртаванасць кіраўніцтва, згуртаванасць дэлегатаў УНС, якія паказалі адзінства ў сваіх падыходах, — гэта прыклад саюзніцкіх адносін Беларусі і Расіі, прыклад для СНД, ЕАЭС. І прыклад таго, што нас так проста не зламаць. І вельмі важна, каб нас чулі і за нашымі межамі», — адзначыў Дзмітрый Мезенцаў.



Ірына ДАЎГАЛА:

### «Мы пракладаем свой шлях, сваю дарогу»



Як заўважыла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Ірына ДАЎГАЛА**, Усебеларускі народны сход, які прайшоў у новым фармаце, паказаў, што новыя шляхі не шукаюць — іх пракладваюць. «І Беларусь пракладае свой шлях для свайго народа, — падкрэсліла дэпутат. — Першае паседжанне УНС у новым статусе паказала, што найважнейшыя прынцыпы яго дзейнасці — вяршэнства права, свабоднага абмеркавання і прыняцця рашэнняў — працуюць. Кожнае слова кіраўніка дзяржавы ўспрымалася як пасыл да дзеяння. Выбар народа — выбар краіны. А выбар у тым, каб мірна жыць, каб гадаваць дзяцей, развіваць сваю краіну і заўсёды быць гатовымі яе абараніць».

Па словах Ірыны Даўгала, выбар Старшыні УНС быў не выпадковы, а ўсвядомлены. «Наш Прэзідэнт — чалавек, якому вераць і давяраюць, — падкрэсліла яна. — У нашай Радзімы, акрамя нас, нікога няма, зазначыў кіраўнік дзяржавы. А значыць, мы пракладаем свой шлях, сваю дарогу — дарогу міру, бяспекі, развіцця і стваральнай працы дзеля якасці жыцця нашых людзей!»

Пётр ВАЙНОЎСКІ:

### «Адзінства і кансалідацыя — наша сіла»



Па словах **вядучага інжынера ПМК №19 г. Жабінка заслужанага меліяратара Рэспублікі Беларусь Пятра ВАЙНОЎСКАГА**, усе дэлегаты сёмага Усебеларускага народнага сходу разумеюць, што ад грамадзянскай пазіцыі, асабістага ўкладу кожнага з іх залежыць усё, што сёння адбываецца ў нашай краіне, і тое, што будзе заўтра. «І калі сёння кожны на сваім працоўным месцы будзе працаваць сумленна і па законе, то ўсё атрымаецца, — лічыць ён. — Нам лёгка вырашаць задачы любой ступені складанасці, калі і далей будзем жыць у мірнай краіне, робячы яе яшчэ больш прыгожай для нашых дзяцей і ўнукаў. Адзінства і кансалідацыя — наша сіла, бо ў кансалідаваным грамадстве і пад кіраўніцтвам аднадумцаў перамога непазбежная. Тактыка, прынятая яшчэ маладым Прэзідэнтам-палітыкам у сярэдзіне 1990-х гадоў, што толькі народ можа вырашыць свой лёс, актуальная і цяпер».

Надзея БУРУНОВА:

### «УНС паслужыць умацаванню міру, стабільнасці на беларускай зямлі»



Па словах **члена Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў (Гарадоцкі раён) Надзеі БУРУНОВАЙ**, тое, што ў тым ліку звычайныя людзі прынялі ўдзел у зацвярджэнні такіх дакументаў, як Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына, сведчыць аб тым, што УНС — сапраўды найвышэйшы орган народаўладдзя. «Правядзенне гэтага найважнейшага мерапрыемства паслужыць умацаванню міру, стабільнасці на беларускай зямлі, паўплывае на паляпшэнне ўзроўню жыцця нашага насельніцтва, — пераканана дэлегат. — Сёння самае галоўнае — кансалідацыя грамадства, мір, спакой, стабільнасць, каб развівалася эканоміка, сельская гаспадарка, сацыяльная сфера. Усё павінна быць на карысць нашых людзей».

Ганна ФІНАГЕНАВА:

### «Мы раслі, сталелі, будавалі родную Беларусь...»



Па словах **загадчыцы вучэбна-метадычнага кабінета Гродзенскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі заслужанага работніка адукацыі Рэспублікі Беларусь Ганны ФІНАГЕНАВАЙ**, кожнаму сёння вельмі важна працаваць з поўнай аддачай, творча і вельмі якасна. «У нашых сілах захаваць мір, нашу Рэспубліку Беларусь, быць разам з нашым Прэзідэнтам, — падкрэсліла яна. — Мяне вельмі ўразіла, як кіраўнік дзяржавы назваў усіх нас сваімі дзецьмі. І не важна, што некаторыя практычна яго ўзросту: мы раслі, сталелі, будавалі родную Беларусь побач з нашым лідарам. І будзем працягваць гэта рабіць».

Прыняцце Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны Рэспублікі Беларусі дэлегатамі VII Усебеларускага народнага сходу Ганна Фінагенава лічыць вельмі мудрым рашэннем. «Мы бачым, што робіцца ў некаторых іншых дзяржавах, якія там кіраўнікі: не думаюць аб міры, сваіх людзях, — прыводзіць прыклад яна. — У той жа час наш Аляксандр Рыгоравіч на працягу многіх гадоў захоўвае мір на нашай зямлі і жыве дзеля людзей, дзеля нас з вамі».

Настасся МІРОНЧЫК-ІВАНОВА:

## «Я б параіла заходнім калегам узяць прыклад з такога дэмакратычнага органа, як УНС»



Вядомая **спартсменка Настасся МІРОНЧЫК-ІВАНОВА** не першы раз удзельнічае ва Усебеларускім народным сходзе, але першы ў новым статусе — дэпутата Палаты прадстаўнікоў. «Што на спаборніцтвах, што на палітычных пляцоўках хапае хвалявання. Але гэта і добра, бо зараджае нас эмоцыямі, надае сіл, каб ісці наперад, дастойна прадстаўляць сваю Радзіму, абараняць яе. Бо мы яе нікому не аддадзім. Лозунг «Час выбраў нас» накіраваны найперш на моладзь. Гэта як заклік для маладых беларусаў — захаваць стабільнасць у краіне, незалежнасць і бяспеку», — сказала яна.

Настасся Міірончык-Іванова назвала Усебеларускі народны сход сапраўды сямейнай падзеяй. «Канструктыўны дыялог кіраўніка дзяржавы з беларускім народам гэта пацвярджае. Нашым заходнім калегам я б параіла браць з нас прыклад такога дэмакратычнага органа, як УНС, і павучыцца так весці дыялог са сваім народам, як гэта робіць наш Прэзідэнт», — заявіла яна.

Ігар ГЕНЕЦ:

## «Дакладны курс на тое, каб у краіне было ціха і спакойна»



**Старшыня Іўеўскага раённага выканаўчага камітэта Ігар ГЕНЕЦ** лічыць, што для нашых людзей самае галоўнае, каб у краіне было мірна і спакойна. «І VII Усебеларускі народны сход — пацвярджэнне таму, што ў нас, у Беларусі, дакладны курс на тое, каб у краіне было ціха, спакойна, каб людзі маглі працаваць і выхоўваць дзяцей, — адзначыў ён. — Сёння кожны чалавек разумее, што ён з'яўляецца часцінкай сваёй дзяржавы. І таму, калі чалавек сумленна робіць сваю справу, ён дакладна ведае, што робіць гэта не толькі на карысць сваёй сям'і, але і ў цэлым краіны».

Па словах старшыні райвыканкама, і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, і Ваенная дактрына, якія прынялі дэлегаты, з'яўляюцца двума найважнейшымі дакументамі, згодна з якімі наш народ будзе жыць мінімум найбліжэйшыя дзесяць гадоў. «Змяненні ў параўнанні з папярэднімі праектамі дакументаў даволі істотныя, улічваючы тую палітычную сітуацыю, якая складваецца вакол нас, — канстатаваў Ігар Генец. — Але ў Ваеннай дактрыне дакладна прапісана, што беларусы — народ мірны і ні на кога нападаць не збіраюцца».

Таццяна ФІЛІМОНАВА:

## «Канстытуцыйны статус УНС дапаможа нашай дзяржаве яшчэ больш інтэнсіўна развівацца»



**Намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, старшыня Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццяна ФІЛІМОНАВА** падзялілася сваімі ўражаннямі ад удзелу ва УНС. «Кіраўнік дзяржавы ў сваім выступленні настолькі прапускаў праз сэрца ўсё, што казаў. Здавалася б, відавочныя рэчы, але яны былі прадстаўлены Прэзідэнтам так, што кожны задумаўся, як шмат краіна зрабіла за 30 гадоў. Як сказаў Аляксандр Рыгоравіч, наша краіна сапраўды знаходзіцца на пераломным этапе сваёй гісторыі. І канстытуцыйны статус Усебеларускага народнага сходу дапаможа нашай дзяржаве яшчэ больш інтэнсіўна развівацца. Мы, народ, мы дэлегаты Усебеларускага народнага сходу, будзем дапамагаць нашаму Прэзідэнту весці краіну наперад і толькі наперад», — сказала яна

Аляксей ПРЫМАКОЎ:

## «УНС — гэта калектыўны розум, які гарантуе аптымальны варыянт развіцця грамадства»



Фота з архіва Магілёўскага інстытута МУС.

Сярод прадстаўнікоў Магілёўшчыны з ліку моладзі БРСМ у VII Усебеларускім народным сходзе браў удзел і **дацэнт кафедры крымінальнага права, крымінальнага працэсу і крыміналістыкі Магілёўскага інстытута МУС маёр міліцыі Аляксей ПРЫМАКОЎ.** Малады чалавек перакананы, што названая форма народаўладдзя зможа поўна і дакладна ўвасобіць волю ўсяго беларускага народа.

«Гэта калектыўны розум, заклікаць выбіраць аптымальны варыянт развіцця краіны, стабілізаваць грамадства на ўсіх этапах яго развіцця і здзяйсняць сур'ёзны народны канстытуцыйны кантроль над усімі самымі галоўнымі працэсамі ў краіне, — кажа ён. — Усебеларускі народны сход вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы, забяспечвае непахіснасць канстытуцыйнага ладу, пераемнасць пакаленняў і грамадзянскую згоду».

Аляксей Прымакоў адзначае, што вялікі давер выклікаюць як абранае кіраўніцтва УНС, так і камісія з 13 дэлегатаў, якія прадстаўляюць розныя сферы і пласты нашага грамадства. На яго погляд, найважнейшыя, асабліва на сёння, для краіны дакументы — гэта абноўленая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына, якія рэгламентуюць падыходы дзяржавы да забеспячэння ўласнай бяспекі ў розных сферах з улікам геапалітычных змяненняў у свеце, асноўныя погляды дзяржавы на мір і вайну, прымяненне ваеннай сілы ў рамках рэагавання на існуючыя выклікі, рызыкі і пагрозы. Пры гэтым у палажэннях зацверджаных дакументаў прасочваецца міралюбівы і добразычлівы характар беларускага народа і яго пазіцыі па названым кірунку.

«Асобна хочацца выказаць ураджанне ад выступлення нашага Прэзідэнта — Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, які вельмі эмацыянальна, але ў той жа час узважана і дакладна расставіў прыярытэты і акцэнтаваў увагу на пэўных ключавых пунктах і палажэннях прынятых дакументаў, падзякаваў за праведзеную работу і вызначыў арыенцір у форме пасылу на найбліжэйшую будучыню лозунгам «Час выбраў нас», — выказаўся суразмоўнік.

Юрый КАРАЕЎ:

## «Прымаць стратэгічныя рашэнні разам важна найперш псіхалагічна»



**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Гродзенскай вобласці Юрый КАРАЕЎ** падкрэсліў: вельмі важна, найперш псіхалагічна, што найважнейшыя стратэгічныя пытанні вырашаюцца калектыўна Усебеларускім народным сходам. «Чым адрозніваецца імгненнае рашэнне камандзіра ад таго, якое доўга рыхтуецца, якое можна растлумачыць усім? Рашэнне, прынятае калектывам ці, у нашым выпадку, усенародным веча, набывае для людзей большую маральную вагу. Таму што гэта вырашалі ўсе разам», — сказаў ён.

На думку Юрыя Караева, самае важнае ў прынятых Ваеннай дактрыне і Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі — гэта тлумачэнне, навошта беларусам трэба ядзерная зброя і народнае апалчэнне.

Арсеній ДОЛБІК:

## «Людзі ўцягнуты ў пытанні, якія датычацца забеспячэння суверэнітэту»



**Старшы афіцэр упраўлення ідэалагічнай работы Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Арсеній ДОЛБІК** падкрэсліў, што з зацвярджэннем дэлегатамі УНС Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны прыняты рашэнні па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі і абараназдольнасці. «Да таго, як зацвердзіць гэтыя важныя дакументы, была праведзена вельмі вялікая работа: вывучаліся меркаванні, глыбока аналізаваліся абстаноўка, якая складваецца вакол граніц Рэспублікі Беларусь, магчымасці нашай абараназдольнасці, — канкрэтызаваў ён. — Прыняцце дэлегатамі УНС і Канцэпцыі, і Дактрыны сведчыць аб уцягнутасці ўсіх людзей у пытанні, якія датычацца забеспячэння суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці нашай краіны. І тут вельмі дарэчы словы кіраўніка дзяржавы, які сказаў аб тым, што нам усім неабходна быць разам, гатовымі да ўсяго і нічога не баяцца. У прыватнасці, для нас, пагранічнікаў, гэта самыя важныя словы».

Станіслаў БАЖЫЧКА:

## «Кожны грамадзянін павінен абараняць нашу краіну, яе незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць»



Як адзначыў **намеснік начальніка па ідэалагічнай рабоце 62-га цэнтральнага вузла сувязі Міністэрства абароны маёр Станіслаў БАЖЫЧКА**, Усебеларускі народны сход чарговы раз пацвердзіў, што на чале нашай беларускай сям'і стаіць сапраўдны абаронца, лідар, які рухае нацыю наперад, пры гэтым ніколі не здраджваючы людзям. «Здрадніцтва — гэта самае страшнае, што можа быць у любой дзяржаве, а тым больш такой невялікай, як Беларусь», — лічыць ваеннаслужачы.

Па словах дэлегата, Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, Ваенная дактрына, зацверджаныя на УНС, датычацца не толькі людзей у пагонах, а ўвесь народ. «Як напісана ў Канстытуцыі, кожны грамадзянін павінен абараняць нашу краіну, яе незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць, — падкрэсліў Станіслаў Бажычка. — Усе павінны разумець, што трэба будзе будаваць сваю дзейнасць так, каб увасобіць у жыццё ўсе кірункі развіцця, закладзеныя Канцэпцыяй. Што датычыцца Ваеннай дактрыны, яна застаецца, як і была, абарончай: мы нікому не пагражаем і ні на кога не збіраемся нападаць, але трэба разумець: калі нехта да нас прыйдзе з мячом, ад мяча і загіне. У адзіным парыве мы станем на абарону нашай Рэспублікі Беларусь».

Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ:

# «Калі да нас нехта прыйдзе з мячом, мы адкажам»

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ** лічыць вельмі важным, што такія стратэгічныя дакументы, як Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі і Ваенная дактрына, прымаюцца на Усебеларускім народным сходзе. «У іншых дзяржавах такіх прэцэдэнтаў няма, — падкрэсліла дэпутат. — Ранейшая Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі была прынята ў 2010 годзе, яна была грунтоўная, актуальная для таго часу. Памяняліся ўмовы, з'явіліся новыя выклікі, пагрозы. Таму вельмі важна выпрацаваць канкрэтныя індыкатары для таго, каб гэтым выклікам і пагрозам супрацьстаяць».



Парламентарый нагадала, што Канцэпцыя абноўлена на 70 %. «З'явіўся абсалютна новы від бяспекі — біялагічная бяспека, і гэта сведчыць аб тым, што мы ідзём у нагу з часам, — звярнула ўвагу яна. — Навелай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі стала такое новае паняцце, як электаральны суверэнітэт. Гэта важна, асабліва ў гэты электаральны перыяд. Мы не дазваляем нікому ўмешвацца ў выбары ў нашай краіне. Дарэчы, дэпутаты прынялі шэраг законаў для таго, каб замацаваць электаральны суверэнітэт: Закон «Аб асновах грамадзянскай супольнасці», Закон «Аб палітычных партыях», Закон «Аб Усебеларускім народным сходзе». УНС — гэта засцерагальнік, стабілізатар, які будзе стоп-кранам у самы складаны перыяд для нашай краіны».

Па словах Марыны Лянчэўскай, вельмі грунтоўным і своечасовым дакументам з'яўляецца Ваенная дактрына. «Самае галоўнае, што Ваенная дактрына застаецца абаранальнай, — падкрэсліла дэпутат. — Гімн нашай дзяржавы невыпадкова пачынаецца са слоў «Мы, беларусы, мірныя людзі». Так і ёсць. І дактрынай мы падкрэсліваем, што вайны не хочам, але, калі да нас нехта прыйдзе з мячом, мы адкажам».

Сяргей РАЧКОЎ:

# «Беларускі народ яшчэ раз праявіў сваю мудрасць»



**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей РАЧКОЎ** заўважыў, што не кожнаму ўдаецца ў жыцці ўзяць удзел у гістарычных падзеях. А УНС — гэта гістарычная падзея для нашай краіны, для нашай дзяржавы, для нашага народа. «Беларускі народ яшчэ раз праявіў сваю мудрасць, калі падчас рэспубліканскага рэферэндуму аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю прыняў рашэнне надаць канстытуцыйны статус Усебеларускаму народнаму сходу. На мой погляд, вельмі справядліва і правільна паступілі дэлегаты, якія выбралі Прэзідэнта Беларусі Старшынёй УНС. Аляксандр Рыгоравіч — лідар і краіны, і нацыі. Гэта пераемнасць апраўдана. Сёння складаны час, асабліва з пункту гледжання міжнароднай сітуацыі, палітыкі, таму неабходна трымаць уладныя паўнамоцтвы ў адных руках, каб аператыўна і своечасова адказваць на сучасныя выклікі», — сказаў ён.

Парламентарый падкрэсліў, што беларусам вельмі важна было пачуць параўнальны аналіз таго, што адбывалася ў 1990-я гады, і таго, што беларусы маюць сёння, які прадставіў у сваім выступленні Прэзідэнт. «Гэты аналіз неабходны, каб паказаць народу, і найперш моладзі, які шлях мы прайшлі. Цяпер ідзе змена пакаленняў, і трэба паказваць маладым, як мы жылі, якія праблемы вырашылі, дзякуючы мудрасці народа і яго адзінства. Тэма адзінства сёння актуальная як ніколі. Мы бачым, што ў свеце адбываецца. Там, дзе няма адзінства, там пачынаюцца войны. А адзіная Беларусь ідзе сваім шляхам, нарошчвае свой патэнцыял, пашырае кола сяброў. Тое, што Захад зрабіў у адносінах да Беларусі, — гэта стратэгічная памылка. Мы ідзём цяпер на Усход. Мы раней мала ўвагі ўдзялялі Афрыцы, Лацінскай Амерыцы, але зараз мы ўбачылі, які там вялікі патэнцыял. І крок за крокам мы ідзём наперад у сваім развіцці. А Усебеларускі народны сход мабілізуе, аб'ядноўвае і вызначае стратэгію на будучыню», — перакананы Сяргей Рачкоў.

Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ:

# «Кожны дэлегат адчувае сябе часткай гісторыі»



Для **старшыні Маладзёжнага парламента Нацыянальнага сходу Мікіты РАЧЫЛОЎСКАГА гэта першы Усебеларускі народны сход**, і адразу ў канстытуцыйным статусе. «Для мяне гэта вялікі гонар, вялікі давер. Мы разумеем, што пасяджэнне задасць вектары нашага развіцця. Гэта сапраўды гістарычная падзея. Я ўпэўнены, што кожны дэлегат адчувае сябе часткай гісторыі, бо так яно і ёсць. Мы разумеем, што на працягу пяці гадоў прыйдзецца працаваць не складаючы рук для таго, каб апраўдаць гэты высокі давер. Я як дэлегат ад Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі разумею, што на мяне ўскладзена вялікая місія прадстаўляць інтарэсы і законныя правы нашых маладых людзей. Паколькі ў нас ёсць магчымасць працаваць у кожным рэгіёне нашай краіны, будзем актыўна праводзіць сустрэчы з моладдзю. Тут вельмі добра кладзецца сумесны праект Маладзёжнага парламента і БРСМ «Маладзёжны сход». Адразу пасля УНС мы пачынаем праводзіць сустрэчы з моладдзю па ўсёй краіне, дзе будзем атрымліваць зваротную сувязь ад маладых людзей, акумуляваць яе і самыя важныя і цікавыя прапановы выносіць для разгляду на Усебеларускім народным сходзе, каб погляды і меркаванні моладзі былі пачуты і бачны з трыбуны УНС», — расказаў ён.

Яўген КАВАЛЕНКА:

# «Гэта прыступка ў далейшае развіццё»

**Міністр юстыцыі Яўген КАВАЛЕНКА** падкрэсліў, што Усебеларускі народны сход як Канстытуцыйны орган, як суполка, як орган народаўладдзя прайшоў вялікі шлях.



«Пачынаючы з першага Усебеларускага народнага сходу, ён эвалюцыяніраваў, развіваўся разам з беларускай дзяржаўнасцю. Мы яе разам будавалі, праводзілі УНС. І лагічны крок — наданне Усебеларускаму народнаму сходу канстытуцыйнага статусу. Гэта крок доўгачаканы, крок вельмі правільны. І гэта прыступка ў далейшае развіццё. Гэта задзел на будучыню з тым, каб найважнейшыя дзяржаўныя пытанні абмяркоўваліся ўсім народам», — сказаў ён.

Міністр заўважыў, што цяпер пасяджэнне УНС будзе праводзіцца не радзей чым адзін раз на год.

Па яго словах, гэта дае новыя дадатковыя магчымасці для ўзважанага прыняцця найважнейшых для краіны рашэнняў.

Аляксандр РУМАК:

# «Адметнасць нашага грамадства — прадстаўнікі розных канфесій адзіныя»

**Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК** падкрэсліў, што ў сваім выступленні Прэзідэнт заклаў асноўныя вектары развіцця і для новых пакаленняў беларусаў. «Я думаю, што сёння закладваюцца такія гарантыі захавання незалежнасці нашай краіны, якія дазволяць і надалей развівацца. Краіна маладая, тры дзесяцігоддзі — для гісторыі няшмат. І вельмі важна для маладой краіны стварыць і закласці прававыя гарантыі далейшага развіцця і забяспечыць пераемнасць пакаленняў», — сказаў ён.



Аляксандр Румак звярнуў увагу, што сіла беларусаў у тым, што дзяржава шмат робіць, каб шматканфесіянальнае і шматнацыянальнае грамадства жыло ў гармоніі і згодзе. Ён нагадаў, што ў Беларусі жывуць прадстаўнікі 25 канфесій і рэлігійных кірункаў і больш за 150 нацыянальнасцяў. «На жаль, шмат прыкладаў, калі на рэлігійнай аснове ўзнікаюць гарачыя канфлікты. А ў нас у Прэзідыуме УНС знаходзяцца прадстаўнікі дзвюх найбольш уплывовых канфесій — праваслаўнай і каталіцкай. У зале — прадстаўнікі мусульман і іўдзеяў. Гэта яшчэ адна адметнасць нашага грамадства — прадстаўнікі розных канфесій адзіныя і ўсе разумеюць, як важна жыць у ладзе і ў павазе адно да аднаго», — падкрэсліў Упаўнаважаны.

Сяргей ШЛЫЧКОЎ:

# «Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі — атрыманне максімальнага эфекту ад таго, што маем»

**Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЛЫЧКОЎ** адзначыў, што гэта пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу з'яўляецца беспрэцэдэнтным у гісторыі Беларусі. Аналагаў такога органа ў сістэме дзяржаўнага кіравання, па яго словах, больш нідзе няма. «Хоць гэтыя «дэмакратычныя» краіны вучаць нас, як трэба жыць, вучаць нас дэмакратыі, але ў іх і блізка такога органа няма», — сказаў ён.



Асобную ўвагу Сяргей Шлычкоў звярнуў на арганізацыю выбараў дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу.

Па яго словах, у Палацы Рэспублікі сабраліся сапраўды найлепшыя прадстаўнікі беларускага народа, гэта сведчыць аб тым, што да выбараў дэлегатаў паставіліся самым сур'ёзным чынам.

Старшыня ДКНТ падкрэсліў, што, улічваючы канстытуцыйныя паўнамоцтвы УНС, пытанні, якія на ім разглядаюцца, патрабуюць пільнай увагі. «Я ўдзяльнічаў у распрацоўцы Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. І, з пункту гледжання сістэмнага падыходу, мы давялі гэту справу да абсалюту, — сказаў ён. — Галоўная задача нашага камітэта — стварэнне нацыянальнай інавацыйнай сістэмы такім чынам, каб максімальна эфектыўна выкарыстоўваць усе рэсурсы, якія ёсць у краіне. І тое, што цяпер уключана ў Канцэпцыю нацыянальнай бяспекі, максімальна адпавядае гэтай мэце — выбудоўванню нацыянальнай інавацыйнай сістэмы, атрыманню максімальнага эфекту ад таго, што мы маем».

Нэлі ЗІГУЛЯ, Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО. Фота Лізаветы ГОЛАД, Віктара ІВАНЧЫКАВА.

# ПУНКТ АДЛІКУ Ў БУДАЎНІЦТВЕ БУДУЧЫНІ

## Меркаваннямі пра работу VII Усебеларускага народнага сходу падзяліліся жыхары рэгіёнаў

Аляксей ЦАРЫК:

### «СВЯТА ПРАЦЫ ПАД МІРНЫМ НЕБАМ»


Фота Лізаветы ГОЛАД

КСУП «Беражное» Столінскага раёна знаходзіцца ў самай глыбіні Палесся. **Намеснік дырэктара гаспадаркі Аляксей ЦАРЫК** расказаў, як разам з усёй краінай яго калектыў уважліва сачыў за ходам Усебеларускага народнага сходу. «Выступленне кіраўніка дзяржавы, як заўсёды, вызначалася дакладнасцю і надзённасцю, — адзначыў ён. — Найважнейшай падзеяй Сходу стала зацвярджэнне Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны. Мы змаглі ўпэўніцца, што новая Ваенная дактрына кардынальна не памяняла палажэнні ваеннай палітыкі дзяржавы. Захаваны яе абарончы характар».

Важна, што мы заявілі ўсяму свету: «Беларусь — міралюбівая краіна, якая нікому не пагражае, але заўсёды можа даць адпор любой агрэсіі», лічыць намеснік кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства.

«Мы жывём недалёка ад граніцы з Украінай, дзе працягваюцца баявыя дзеянні. Многія з нашых жыхароў маюць на тым баку сваякоў, знаёмых, таму мы, як ніхто, жадаем міру суседняй дзяржаве і, як ніхто, цэнім мір», — падкрэсліў ён.

У «Беражном» завяршаецца пасяўная кампанія, тут займаюцца жывёлагадоўляй, вядзецца будаўніцтва і рэканструкцыя ферм, будуюцца і добраўпарадкоўваюцца жылыя дамы для працаўнікоў, набываецца новая тэхніка. «Пры гэтым, вядома, распрацоўваем планы далейшага развіцця і росквіту сельгаспрадпрыемства. Апошнім часам у нас ідуць угару эканамічныя паказчыкі, пакрысе расце заработная плата. Мы ўсе разам дружна працавалі на суботніку, пасадзілі дрэвы, кветкі, каб нашы вёскі прыгажэлі. Але галоўнай умовай для ажыццяўлення планаў, для захавання дасягнутага становіцца мірнае неба. Думаю, новая Ваенная дактрына дапаможа нашай краіне гэты мір захаваць», — падзяліўся Аляксей Царык.

— Памятаеце, як раней, у савецкі час, на транспарантах пісалі тры словы: «Мір, праца, май»? Вось і цяпер яны надзвычай актуальныя. Будзе мір — будзем працаваць і адзначаць свята працы ды іншыя святы, — падсумаваў суразмоўнік.

Людміла АЛЯКСЕЕВА:

### «СВЕДЧАННЕ САПРАЎДНАЙ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ»


Аляксандры ГВОЗДЗЕВАЙ.

Усебеларускі народны сход пасля надання канстытуцыйнага статусу зацвердзіў яшчэ адзін інстытут удзелу беларусаў у палітычным жыцці краіны, звяртае ўвагу **загадчык Заронаўскага дома культуры Віцебскага раёна Людміла АЛЯКСЕЕВА.**

Гэта дазваляе большай колькасці прадстаўнікоў розных галін народнай гаспадаркі і грамадства ў цэлым быць уцягнутымі ў заканатворчы працэс, лічыць яна. Такія ініцыятывы з'яўляюцца элементамі стварэння сапраўднай сталай грамадзянскай супольнасці. Людміла Аляксеева ўпэўнена, што абмеркаванне найважнейшых пытанняў у такім шырокім фармаце будзе садзейнічаць большай кансалідацыі нацыі, што жыццёва неабходна для дынамічнага, пастульнага развіцця, асабліва ва ўмовах узмацнення міжнароднай канфрантацыі.

Канстытуцыйны статус Усебеларускага народнага сходу, вышэйшага прадстаўнічага органа ўлады, пацвярджае той факт, што Беларусь за тры дзесяцігоддзі прайшла дастойны шлях сацыяльна-эканамічнага развіцця, усебаковага ўмацавання нацыянальнай бяспекі, дадае суразмоўца.

«На парадак дня былі вынесены найважнейшыя для нас пытанні — умацаванне ваеннай бяспекі краіны. Мы — міралюбівы народ, нікому не ствараем праблем, але патэнцыяльныя агрэсары павінны разумець, што мы зможам даць дастойны адпор, — падкрэслівае кіраўнік установы культуры. — Абарона краіны будзе мець усенародны характар, сказаў Прэзідэнт, і ў гэтым няма ніякіх сумненняў. Нам не патрэбны чужыя тэрыторыі, але і сваю зямлю мы не аддадзім. Гэты ўрок мы, беларусы, засвоілі яшчэ 80 гадоў таму».

Загадчык Дома культуры згодна са словамі Прэзідэнта ў тым, што ў дэлегатаў УНС няма права на памылку. «На кожным з нашых суайчыннікаў, народных прадстаўнікоў, ляжыць вялікая персанальная адказнасць. І не толькі ў іх, але і ў нас — кожнага грамадзяніна на сваім працоўным месцы — няма права падвесці ні адно з тых пакаленняў, якімі была пабудавана магутная краіна — Беларусь», — рэзюмавала яна.

Юрый СКРЫПКО:

### «РАШЭННІ СХОДУ ЗАКРАНАЮЦЬ КОЖНАГА БЕЛАРУСА»



Значная палітычная падзея не пакінула раўнадушным ніводнага беларуса, упэўнены **генеральны дырэктар РУП «Кіруючая кампанія холдынга «Беларуская шкляная кампанія» Юрый СКРЫПКО.**

Дэвіз сёлетняга УНС — «Час абраў нас» — вельмі сімвалічны і яскрава адлюстроўвае настрой холдынга «Беларуская шкляная кампанія», дадае яго кіраўнік.

«У сваім выступленні Прэзідэнт скіраваў усіх нас тое, каб захаваць статус моцнай нацыі, а гэта значыць, не схіляцца перад цяжкасцямі, ахоўваць суверэнітэт, быць моцнымі духам. Менавіта ў гэтым і ёсць сіла нацыі, — падкрэслівае Юрый Скрыпко. — Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на галоўнае — беларусы імкнуцца да мірнага жыцця, стваральнай працы».

Беларусы могуць і павінны жыць добра. Але для гэтага, на думку Прэзідэнта, трэба адказна і якасна працаваць. Вельмі важна, што на маштабным форуме пастаўлены задачы на будучую пяцігодку. А яны выцякаюць з тых дасягненняў, якіх удалося дабіцца за апошнія некалькі дзесяцігоддзяў. Пасыл Сходу, па меркаванні генеральнага дырэктара, — цяпер трэба рабіць новыя крокі, ісці далей, замацоўваць найлепшае і прагрэсіўнае ў развіцці краіны.

«Адным з галоўных тэзісаў, на мой погляд, з'яўляецца дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны, — лічыць суразмоўца. — Гэта фундамент нашага грамадства, і яго нельга страціць. Прэзідэнт неаднаразова падкрэсліваў, што Усебеларускі народны сход — стабілізатар грамадства. У сучасным свеце неспакойна, вакол рубяжоў Беларусі ідзе нарошчванне ваенных магутнасцяў. У сувязі з гэтым дэлегатамі Сходу была зацверджана Ваенная дактрына і Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі, што атрымалі такі шырокі рэзананс у грамадстве. Гэтыя пытанні грунтоўна былі разгледжаны падчас работы УНС».

Сёння, па словах Юрыя Скрыпко, мы з'яўляемся сведкамі падзеі, якая, безумоўна, увойдзе ў гісторыю. Гэта ў значнай ступені можна назваць пераломным момантам у навейшай гісторыі Беларусі. Тое, што УНС надаецца канстытуцыйнае права, адпавядае ўсім патрабаванням часу. У прадстаўнічым органе народнай улады ўвасоблены патэнцыял беларускай дзяржавы. Тым самым выконваецца прынцып дэмакратычнага грамадства, якое выступае за мір, згоду і развіццё.

«Толькі разам мы зможам вырашыць, як будзе развівацца дзяржава, — падкрэслівае суразмоўца. — Ніхто не можа дыктаваць нам, як жыць. У гэтым і ёсць дэмакратыя. Таму наперадзе чакае самае галоўнае — карпатлівая праца на карысць грамадства і кожнага беларуса. А УНС стаў своеасаблівым пунктам адліку ў далейшай сумеснай дзейнасці».

Дзмітрый МУРАШКА:

### «ТРЫМАЕМ ПОРАХ СУХІМ»



Шырокае грамадскае абмеркаванне прынцыпаў абароны нацыянальных інтарэсаў надзвычай важнае, падкрэслівае **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў будаўніцтва і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў, першы сакратар Гомельскага абласнога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Дзмітрый МУРАШКА.**

«Для мяне як чалавека ваеннага, афіцэра міліцыі ў запасе тыя тэзісы, якія агучыў наш Прэзідэнт на Усебеларускім народным сходзе, вельмі хвалююча, — падзяліўся ён. — Не магу не адзначыць важнасць прадстаўленых Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны краіны. Перакананы, што зацвярджэнне двух гэтых дакументаў — наш адказ на выклікі часу».

Старшыня абласной прафсаюзнай арганізацыі звяртае ўвагу на тое, што названыя дакументы носяць выключна абарончы характар і ні ў якім разе не наступальны. «Мы ніколі ў сваёй гісторыі ні на каго не нападалі, — нагадвае ён. — Для беларусаў на ментальным узроўні самае галоўнае — мір і спакой. Мы хочам мірна жыць і сябраваць з усімі, як гэта было ў часы Савецкага Саюза, калі разам суіснавалі 15 рэспублік».

Беларусь заўжды рада гасцям, звяртае ўвагу суразмоўца. Яе народ не ўпадае ў істэрыю, што можна ўбачыць у суседніх краінах. «Як наш Прэзідэнт адзначаў, там накіроўваюць неверагодныя сродкі на тое, каб ставіць заборы, узводзіць фарсіфікацыйныя збудаванні, рыць акопы. Пры тым, што гэтыя сродкі можна было б направіць на тое, каб падтрымаць краіны, людзей, якім насамрэч гэтыя сродкі неабходныя для нармальнага жыцця, — дзеліцца Дзмітрый Мурашка. — Беларусь не ставіць заборы, як некаторыя краіны. Але мы пільна сочым за тым, што адбываецца вакол нашых межаў, і трымаем порах сухім».

Суразмоўца паўтарыў выказаную кіраўніком нашай дзяржавы выцццёвую выснову: «Хочаш міру — рыхтуйся да вайны» — і падкрэсліў, што не трэба блытаць міралюбнасць з пацыфізмам.

«У нас дастаткова моцныя ўзброеныя сілы. І, вядома ж, вайскоўцы выразна і зладжана выконваюць свае задачы, — звярнуў ён увагу. — Мне асабіста цягам трох тыдняў давялося праходзіць вучэбныя зборы тэрытарыяльнай абаронай. Паўтаралі тэорыю, адпрацоўвалі навыкі па ахове важных аб'ектаў інфраструктуры, забеспячэнні ваеннага становішча. Асабіста пераканаўся, якая сістэмная работа вядзецца ў нашых Узброеных Сілах. Пераканаўся чарговы раз у дальнабачнасці рашэнняў кіраўніка нашай дзяржавы».

Прэзідэнт імгненна зрэагаваў на негатыўныя перадумовы ў суседніх краінах, звяртае ўвагу Дзмітрый Мурашка. Ён згодны, што нельга ігнараваць сітуацыю, калі з трох бакоў нашу краіну акружаюць натаўскія войскі. Лічыць рашэнне Прэзідэнта праверыць ваенную падрыхтоўку афіцэраў і салдат запасу, узбраенне мудрым. «Мы павінны быць гатовы абараніць сваю Радзіму», — упэўнены суразмоўца.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## Информация об ОАО «БЕЛГОРХИМПРОМ» и его деятельности по состоянию на 01 января 2024 г.

| **4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %):** | | 0 |
|---|---|---|
| Вид собственности | Количество акций, шт. | Доля в уставном фонде, % |
| республиканская | | |
| коммунальная всего: | 0 | 0 |
| в том числе: | X | X |
| областная | | |
| районная | | |
| городская | | |

**5-6. Информация о дивидендах и акциях:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Количество акционеров, всего | лиц | 431 | 433 |
| в том числе: юридических лиц | лиц | 4 | 4 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | | |
| в том числе: физических лиц | лиц | 427 | 429 |
| из них нерезидентов Республики Беларусь | лиц | 4 | 4 |
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | тысяч рублей | 0,00 | 0,00 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа __ | рублей | | |
| Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа __ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги) | рублей | 0,000000 | 0,000000 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа __ | рублей | | |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа __ | рублей | | |
| Период, за который выплачивались дивиденды | первый квартал, полугодие, девять месяцев, год | | X |
| Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов | число, месяц, год | | X |
| Срок (сроки) выплаты дивидендов | число, месяц, год | | X |
| Обеспеченность акции имуществом общества | рублей | -1393,75 | -1176,48 |
| Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего | штук | 0 | 0 |

**7. Отдельные показатели деятельности открытого акционерного общества:**

| Показатель | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 49628,00 | 67535,00 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тысяч рублей | 33132,00 | 35013,00 |
| Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тысяч рублей | -74393,00 | 6746,00 |
| в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тысяч рублей | 16496,00 | 32522,00 |
| прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тысяч рублей | -51226,00 | -32165,00 |
| прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности | тысяч рублей | -39663,00 | 6389,00 |
| Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тысяч рублей | -3590,00 | 6071,00 |
| Чистая прибыль (убыток) | тысяч рублей | -70803,00 | 675,00 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | тысяч рублей | -458359,00 | -387583,00 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | тысяч рублей | 53,00 | |
| Долгосрочные обязательства | тысяч рублей | 456196,00 | 358966,00 |

| Акции, поступившие в распоряжение общества | | | Акции, приобретенные в целях сокращения общего количества | |
|---|---|---|---|---|
| Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, шт. | Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества | Дата зачисления акций на счет «депо» общества | Количество акций, шт. |
| **Всего** | **0** | | | **0** |

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждены годовой отчет, бухгалтерский баланс, отчет о прибылях и убытках за отчетный год: 29 марта 2024 г.
Аудиторское заключение по бухгалтерской и (или) финансовой отчетности подготовлено: 05.03.2024 г.
Аудит проведен (наименование аудиторской организации (для индивидуального предпринимателя – фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется)); местонахождение аудиторской организации (для индивидуального предпринимателя – место жительства); дата государственной регистрации, регистрационный номер в ЕГР. ООО «Бизнес Ашуренс», РБ, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, 8-й этаж, помещение 7, Решение Минского городского исполнительного комитета от 29.05.2001 г., в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190241132.
Период, за который проводился аудит: 2023 г.
Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской и (или) финансовой отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской и (или) финансовой отчетности – сведения о данных нарушениях: отказ от выражения аудиторского мнения.
Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: размещение на ЕПФР 22.04.2024.
13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): Общество работает по разработанным и утвержденным локальным нормативным правовым актам: Устав, Положение о порядке начисления и выплаты дивидендов, Положение об аффилированных лицах, Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг.
14. Адрес официального сайта открытого акционерного общества в глобальной компьютерной сети Интернет: http://bmci.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5, www.ipmtorgi.by | |
|---|---|---|
| **Продавец** | ЗАО «ПУХОВИЧСКИЙ АГРОПРОДУКТ», 222830, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Последовича, 4 | |
| **Предмет электронных торгов** | | |
| № лота | Наименование, инвентарный номер (№ кузова) | Начальная цена, с НДС 20 % |
| 1 | **Административное помещение с баром** (помещение многофункциональное, инв. № 602/D-29081, 487,9 кв. м, по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Буденного, 1-1). **Зал игровых автоматов с административно-складскими помещениями** (помещение многофункциональное, инв. № 602/D-29082, 126,6 кв. м, по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Буденного, 1-2) | 417 000 долл. США |
| 2 | **Трактор МТЗ «Беларус-1523.3»**, 2023 г. в., № кузова Y4R152305P1101621 | 170 232,00 руб. |
| 3 | **Трактор МТЗ «Беларус-2022.3»**, 2023 г. в., № кузова Y4R202202P1100485 | 217 440,00 руб. |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 10 (десять)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение (по лоту № 1 – 2 %, по лотам №№ 2, 3 – 4 %) от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.03.2024 г.

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.05.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **23.05.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные данные** — **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

## ООО «СидНеА» организует конкурсные торги:

| Дата и время проведения | Предмет (право на заключение договоров купли-продажи/аренды) | Начальная цена (в бел. руб. эквивалентная по курсу НБ РБ на день проведения торгов) | Общая площадь | Конкурсное обеспечение в бел. руб. | Срок заключения договора купли-продажи/ аренды |
|---|---|---|---|---|---|
| **27.05.2024, 12.00** | Продажа дачного домика с инв. № 620/С-46097 по адресу: Минская обл., Дзержинский р-н, Демидовичский с/с, СТ «Перхурово», д. 71 | 94900 | 101,2 кв. м | 10 | 90 |
| **27.05.2024, 13.00** | Аренда квартиры с инв. № 500/D-372667 по адресу: г. Минск, ул. М. Лынькова, д. 9, кв. 123 | 350 | 62,83 кв. м | 10 | 10 |
| **27.05.2024, 14.00** | Продажа квартиры с инв.№ 614/D-27319 по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Гавриила Тихова, д. 9, кв. 47 | 48000 | 59,4 кв. м | 10 | 90 |

## Изменение условий по объекту торгов:

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **16.05.2024, 12.00** | Продажа дачного домика с инв. № 632/С-32009 по адресу: Минская обл., Воложинский р-н, Раковский с/с, СТ «ЧАБАРОК-3», д. 30 | 54900 | 65,6 кв. м | 10 | 90 |
| **16.05.2024, 11.00** | Продажа садового домика с инв. № 600/С-179523 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Петришковский с/с, СТ «Мара-Росинка», д. 119 | 89800 | 97 кв. м | 10 | 90 |

Торги состоятся по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Срок внесения конкурсного обеспечения и приема заявлений с прилагаемыми к нему документами прекращаются за один рабочий день до проведения торгов по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 1Б, каб. 7, 7-й этаж. Победитель торгов в день проведения подписывает протокол о результатах торгов. Иные условия проведения объявленных конкурсов: право подачи и подписания заявления о государственной регистрации договора купли-продажи и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с правилами проведения конкурсов по продаже (аренде) имущества ООО «СидНеА», утвержденным приказом директора от 05.03.2024 № 9-ОД. Организатор вправе отказаться от конкурсов (повторного конкурса) в любое время до начала торгов. Телефон для справок (+37529)171-50-50.

УНП 193734126

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже пустующего жилого дома в частную собственность в д. Швабы, ул. Молодежная, д. 2 Швабского сельисполкома Логойского района Минской области

| | |
|---|---|
| Форма проведения аукциона | Открытый |
| Наименование предмета аукциона | Жилой дом |
| Дата, время и место проведения аукциона | **31 мая 2024 года в 11.00, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельисполком, зал заседаний** |
| Продавец и его адрес, телефоны | Швабский сельский исполнительный комитет, 223118, Минская область, Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26. Тел.: 1774-59-2-35; 1774-59-1-35; А1 291061617 |
| Местонахождение имущества | Минская область, Логойский район, д. Швабы, ул. Молодежная, д. 2 |
| Общая площадь жилых помещений | 83,8 кв. м |
| Жилая площадь | 47,0 кв. м |
| Описание имущества | Двухэтажный, одноквартирный жилой дом, материал стен – блок, обложенный кирпичем, деревянные перекрытия, крыша – шифер, отопление паровое. Водопровод, канализация, газоснабжение – баллон. Электроснабжение центральное. Степень износа – 60 %. Составные части и принадлежности: подвал, холодная – пристройка, летняя кухня, сарай и сарай пристройка |
| Условия аукциона по продаже пустующих домовладений | Возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в соответствии с актом выполненных работ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. рублей | 38162,84 бел. руб. |
| Сумма задатка и реквизиты продавца | 20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, **7632,57 руб.,** получатель – Швабский сельисполком, BY21AKBB36006191611010000000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, г. Логойск, ул. Пролетарская, д. 1, УНП 600537220, код платежа 04707 |
| Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (без учета стоимости размещения извещения о проведении аукциона), бел. руб. | 627,07 + объявление в газету |
| Адрес земельного участка | Минская область, Логойский район, д. Швабы, ул. Молодежная, д. 2 |
| Площадь земельного участка | Не зарегистрирован |
| Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Дата начала приема документов | С даты объявления аукциона |
| Окончательный срок приема документов | 24 мая 2024 года до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021 года № 844 п. 1, на основании решения Швабского сельского исполнительного комитета.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Для участия в аукционе предоставляются:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:
- копия платежного поручения о внесении суммы задатка;
- гражданин предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе заключается СОГЛАШЕНИЕ о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с Швабским сельским исполнительным комитетом.

Осмотр пустующего дома осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, **обязан:**

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, внести плату за предмет аукциона;
- подать заявление о предоставлении земельного участка.

После принятия соответствующего решения – обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды – заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией.

УНП 192741810

**ООО «КорпКонсалт-Инвест»** информирует
**об изменении начальной цены продажи имущества**
(публикация извещения в газете «Звязда» от 23.04.2024 г.)
Начальная цена лота № 2 –
административное помещение № 14 составляет
**570 469 бел. рублей** без НДС (1 955 бел. руб. за 1 кв. м).
Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06, www.ipmtorgi.by

# ЯКОЕ ЯНО, ШКОЛЬНАЕ МЕНЮ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— На працягу ўсяго мінулага года мы шчыльна працавалі над пытаннямі ўдасканалення арганізацыі харчавання ў школах. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы выпрацавалі шляхі, падыходы, рашэнні. Арганізавалі спачатку іх апрабацыю ў 23 школах, адсочвалі зваротную рэакцыю з боку вучняў, бацькоў, наглядных органаў, абмяркоўвалі з практыкамі. Па выніках пілотнага праекта распрацаваны і даведзены да выканаўцаў неабходная нарматыўная база, метадалагічныя рэкамендацыі па арганізацыі харчавання, інфармацыйны зборнік новых тэхналагічных карт страў і вырабаў, далі свабоду школам у выбары найбольш аптымальных графікаў арганізацыі харчавання, арганізавалі дадатковы закуп неабходнага тэхналагічнага абсталявання, што істотна палепшыла матэрыяльна-тэхнічную базу школьных харчаблокаў, — сказаў кіраўнік урада краіны.

У цэлым праведзеную работу прэм'ер-міністр ацаніў станоўча. Але падкрэсліў пры гэтым, што пытанні, якія яшчэ засталіся, трэба вырашаць не адкладаючы. Бо ўжо да 1 верасня 2024 года ўсе школы павінны перайсці на новую арганізацыю рэжыму харчавання. Пра тое, на якой стадыі гатоўнасці да гэтага кроку ўстановы адукацыі Мінска, як развіваўся праект і якія змены прыўнёс у школьнае харчаванне, мы папрасілі расказаць **намесніка старшыні Камітэта па адукацыі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Глеба ЛАЎРЫНОВІЧА.**

Нашу гутарку мы пачалі з таго, што ў Беларусі харчаванню школьнікаў і дзяцей дашкольнага ўзросту традыцыйна аддавалася вялікая ўвага.

— Дзесяцігоддзі школьнае харчаванне нашых дзяцей будавалася на аснове зборніка рэцэптур. Спіс страў там быў прыстойны. Але ўспомніце: ён быў дастаткова аднастайны. Каша, катлета, варанае яйка, чай, батон з маслам і кампот. Такім і быў рацыён — простым і бяспечным. Але час ідзе, смакавыя перавагі ў дзяцей, як і ў дарослых, мяняюцца, з'яўляюцца новыя прадукты. Так і ўзнікла неабходнасць нешта ў гэтым найважнейшым пытанні мяняць — бо гаворка ідзе аб захаванні здароўя дзяцей і стварэнні для іх бяспечных умоў. Узнікла неабходнасць — стартаваў і пілотны праект, арганізаваны Міністэрствам адукацыі Беларусі, — сказаў наш суразмоўца.

***— Глеб Мікалаевіч, як развіваўся праект і да чаго мы прыйшлі сёння?***

— У Мінску 156 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі перайшло на новыя ўмовы арганізацыі харчавання. Эксперымент быў распачаты ў 2022 годзе, яго актыўная фаза праходзіла ў перыяд трэцяй і чацвёртай чвэрцяў 2022/2023 навучальнага года. Цяпер ідзе ўкараненне яго вынікаў. Работа праведзена сур'ёзная. Абноўленыя рацыёны харчавання школьнікаў, і сёння дзейнічае новы зборнік тэхналагічных страў, які змяшчае больш чым 300 найменняў. Падкрэслю, усе яны былі падабраны зыходзячы з пераваг нашых навучэнцаў. Усе новыя стравы, распрацаваныя ў рамках эксперыменту, ужо ўкаранёны ва ўстановах адукацыі. У Мінску дзейнічае адзінае меню для ўсіх школ. Сур'ёзна абнавілася і матэрыяльна-тэхнічная база харчаблокаў. У 2023 годзе было закуплена больш за 4,6 тысячы адзінак тэхналагічнага абсталявання.

Але я хачу адзначыць, што сутнасць эксперыменту была не ў тым, каб кардынальна змяніць падыходы да школьнага харчавання — яно ў нас дастаткова збалансавана. Сутнасць у тым, каб павысіць прывабнасць школьнага харчавання для дзяцей і іх бацькоў. Менавіта ў гэтым кірунку мы і працавалі.

***— Якія стравы ў школьнікаў самыя папулярныя, любімыя?***

— Усіх не пералічу, але адно з іх, простае, без вынаходстваў і добра ўсім знаёмае — пельмені. Для школьнага меню зроблены яны, вядома, па асаблівай рэцэптуры, дапушчаны да дзіцячага харчавання, не супярэчаць санітарным нормам. І дзеці іх прынялі вельмі добра. Дарэчы, пасля Мінска гэтую страву пачалі ўключаць у меню і ў рэгіёнах.

Калі працягваць аб навінках, то ў рацыён школьнікаў мы ўвялі такі карысны прадукт, як печань. Сам па сабе сярод дзяцей ён не вельмі папулярны, затое мае карысць для росту арганізма. І тэхнолагі камбіната школьнага харчавання прыдумалі такое выйсце: замест таго каб рабіць банальныя пячоначныя катлеты, якія не кожнае дзіця стане есці, прапрацавалі рэцэпт, дзе карысная печань міксуецца са смачным мясам, напрыклад свінінай. Атрымалася. Дзеці такую страву ядуць з задавальненнем. Або ўзяць кампот з ягад, садавіны, сухафруктаў. Таксама карысны і смачны напой. Але дзеці яго не п'юць. Чаму? Аказалася, у большасці выпадкаў з-за наяўнасці так званай цвёрдай часткі — тых самых кампанентаў, з якіх ён варыўся. Яны, як правіла, займалі паўшклянкі. Даручылі камбінату школьнага харчавання разабрацца з гэтай праблемай. І ўжо сёння ў лінейцы напояў для школьнікаў з'явіўся кампот у чыстым у літаральным сэнсе слова сваім выглядзе. Больш за тое, у рэцэптуру напояў пачалі ўводзіць карысныя, практычна лячэбныя кампаненты, такія, напрыклад, як абляпіха.

> **«Сутнасць эксперыменту была не ў тым, каб кардынальна змяніць падыходы да школьнага харчавання — яно ў нас дастаткова збалансавана. Сутнасць у тым, каб павысіць прывабнасць школьнага харчавання для дзяцей і іх бацькоў».**

***— Пагадзіцеся, усякі добры пачатак мае патрэбу ў прасоўванні.***

— Падчас эксперыменту мы праводзілі шырокамаштабную тлумачальную работу, працягваем яе і цяпер. Навацыі, змены, тлумачэнні па школьным харчаванні — уся гэтая інфармацыя размяшчаецца на інтэрнэт-рэсурсах школ, у тэматычных групах, якія ёсць у месенджарах, бацькоўскіх чатах і гэтак далей. Зборнік тэхналагічных карт страў ёсць на сайтах профільнага міністэрства і ўстаноў адукацыі ў свабодным доступе, гэта значыць, кожны з бацькоў можа паглядзець рэцэптуры, па якіх гатуецца ежа для дзяцей.

Больш за тое, у адной са школ Заводскага раёна сталіцы мы ўвялі наступную практыку: бацькі, у якіх ёсць магчымасць і вольны час, наведваюць установу адукацыі перад перапынкам, на якім дзеці ядуць. Бацькі кантралююць працэс з таго моманту, калі пачынаюць накрываць сталы. Яны могуць уносіць заўвагі ці прапановы. Такім чынам кантроль пераходзіць у супрацоўніцтва, і гэта, паверце, вельмі карысны для справы досвед. Ведаю, у Мінску шэраг устаноў адукацыі ўжо перанялі. Калі казаць аб тлумачальнай рабоце, то мы выкарыстоўваем самыя розныя формы. Напрыклад, у 52-й сталічнай школе папулярызуюць здаровае харчаванне, запрашаючы адпаведных спецыялістаў на школьныя мерапрыемствы. А работнікі камбіната школьнага харчавання на такіх мерапрыемствах ладзяць дэгустацыі школьных страў.

***— Здаровае харчаванне як паняцце агульнае вядома ўсім. Але, напэўна, ёсць істотныя адрозненні паміж правільным харчаваннем дзяцей, падлеткаў і дарослых людзей?***

— Вядома, ёсць. У падлеткаў выдатак энергіі нашмат вышэй, чым у дарослага чалавека, і запатрабаванне ў энергіі і харчовых рэчывах, адпаведна, вышэй. Папаўняць гэта запатрабаванне неабходна, але без шкоды для здароўя. На гэта і накіраваны рацыён школьніка. Усё меню, якое ёсць у школах, — гэта здаровае харчаванне. Ёсць такое паняцце, як дзіцячая дыетэтыка. Дык вось сёння выключана сітуацыя, калі ў меню вучняў школ або выхаванцаў дашкольных устаноў трапляе нейкі прадукт, які не адпавядае дзіцячай дыетэтыцы. Меню ўстаноў адукацыі абавязкова ўзгадняецца з санітарнай службай, а там за гэтым сочаць строга. Пры гэтым перапрацоўчыя прадпрыемствы Беларусі сёння выпускаюць шмат прадукцыі з маркіроўкай «Для дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту». Гэтая маркіроўка — факт праходжання праверкі прадуктаў Рэспубліканскім цэнтрам гігіены і эпідэміялогіі. Такая прадукцыя і выкарыстоўваецца ў школьным харчаванні. У падрыхтоўцы дзіцячых страў не выкарыстоўваюць чорны і чырвоны перац, воцат. Таксама там адсутнічаюць хрэн, кетчуп і гарчыца.

***— Ці адпавядаюць нормам здаровага харчавання дзяцей прадукты, якія яны купляюць у школьных буфетах?***

— Ажыццяўляючы пілотны праект, мы не пакінулі без увагі і буфетную прадукцыю. Яна таксама павінна быць здаровай і карыснай. Дзеці прыходзяць у буфет у асноўным па ласункі, выпечку, напоі. Мы пачалі ўводзіць у іх асартымент прадукты з нізкім утрыманнем цукру, рэалізоўваць шакалад без цукру «Прэзідэнт», пазбаўляцца ад газаваных напояў, замяняючы іх сокамі. Што датычыцца выпечкі, то ў большасці школ яна ўласнай вытворчасці. Выпякаецца ў параканвектаматах, якімі мы абсталявалі харчаблокі таксама ў рамках пілотнага праекта, і атрымліваецца яна не проста смачнай, а яшчэ і максімальна натуральнай і карыснай. Зрэшты, як і ўся астатняя ежа, прыгатаваная на гэтым абсталяванні.

***— Якім бы ні было сучасным абсталяванне, галоўным на кухні застаецца кухар. Якія патрабаванні сёння выстаўляюць для работнікаў школьнай кухні?***

— З абавязковых — чацвёрты поварскі разрад. Гэта значыць, спецыяліст ведае тэхналогію прыгатавання, патрабаванні да якасці і тэрмінаў захоўвання прадуктаў і гатовых страў, валодае метадамі вызначэння якасці прадуктаў. Сёння нашы ўстановы адукацыі на 95 % укамплектаваны кухарамі. У мінулым годзе прайшлі кваліфікацыю і павысілі разрад да неабходнага больш як 100 чалавек, з пачатку гэтага — каля 50 кухараў. Аб якасці іх працы гаворыць той факт, што адходы значна знізіліся, у той час як ахоп школьнікаў гарачым харчаваннем, наадварот, вырас. А пакінутыя дзецьмі пасля абеду пустыя талеркі служаць найлепшай пахвалой і стымулам для далейшага ўдасканалення.

***— Пытанне педантычнае. Не ўсе дзеці, на жаль, здаровыя. І сярод медыцынскіх прызначэнняў ёсць спецыяльныя патрабаванні па харчаванні.***

— У арганізацыі школьнага харчавання ўлічаны і такі варыянт. Для таго каб забяспечыць дзіця дыетычным харчаваннем, дастаткова медыцынскага дакумента з дыягназам і адпаведнымі прадпісаннямі. І калі нават такое дзіця будзе адзіным у школе, для яго будуць асобна гатаваць ежу, якая адпавядае дыеце.

***— Якія задачы ставяцца на перспектыву, калі пілотны праект перастане быць пілотным, а навацыі, прыўнесеныя ў ходзе яго рэалізацыі, стануць нормай школьнага грамадскага харчавання?***

— Нейкіх кардынальных змен ужо не будзе. Сумесная работа Міністэрства адукацыі і Міністэрства аховы здароўя па тэхналагічных картах прадоўжыцца, таму што сам па сабе гэты працэс бесперапынны і патрабуе пастаяннага абнаўлення. Спецыялісты камбіната школьнага харчавання будуць удасканальваць стравы, якія ўжо ёсць, разнастаіць іх. Тлумачальная работа будзе таксама працягнутая: падумаем над яе новымі, магчыма, больш відовішчнымі і цікавымі фарматамі.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Францыі заявіў, што Еўропа можа памерці



Эмануэль Макрон заявіў падчас прамовы ва ўніверсітэце Сарбоны ў Парыжы, прысвечанай будучыні Еўрапейскага саюза, што Еўропа можа памерці. Аб гэтым паведаміла France Info. Макрон папярэдзіў, што Еўропа падвяргаецца вялізнай рызыцы апынуцца ў «ніжэйшай лізе». «Нам трэба пабудаваць такую Еўропу, якая была б у стане паказаць, што яна не з'яўляецца васалам ЗША і здольная размаўляць з усімі», — заявіў прэзідэнт Францыі. Ён папярэдзіў аб пагрозе «збяднення» Еўропы, у тым ліку з-за дзеянняў ЗША на сусветных рынках. Ён звярнуў увагу на «гульні з празмернымі субсідыямі» і прывёў у прыклад прыняцце закона ў ЗША аб зніжэнні інфляцыі, які садзейнічаў прыцягненню ў Злучаныя Штаты еўрапейскіх прадпрыемстваў. Паводле яго слоў, таксама трэба мецъ гатоўнасць да выбудоўвання адносін з Расійскай Федэрацыяй пасля завяршэння ўкраінскага канфлікту: «Наша сістэма бяспекі дапамажа нам пасля заканчэння канфлікту ва Украіне выбудаваць суседскія адносіны з Расіяй».

### Тайланд прапанаваў правесці сустрэчу краін АСЕАН для ўрэгулявання канфлікту ў М'янме



Тайланд прапанаваў правесці сустрэчу з удзелам краін Паўднёва-Усходняй Азіі з мэтай пошуку шляхоў урэгулявання грамадзянскага канфлікту ў М'янме. Пра гэта заявіў генеральны дырэктар дэпартамента інфармацыі, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Тайланда Нікандэт Пхалангкун, паведаміла ТАСС. Паводле яго слоў, адпаведная прапанова была накіравана Інданезіі, Малайзіі, а таксама Лаосу, які сёлета старшынствуе ў Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі (АСЕАН). «Месца і час яшчэ не вызначаны канчаткова. Сустрэча можа прайсці ў Тайландзе», — сказаў ён, адзначыўшы, што «любая краіна — член АСЕАН можа далучыцца». Як адзначыў генеральны дырэктар дэпартамента інфармацыі, сітуацыя вакол м'янманскага горада М'явадзі, дзе ў апошнія дні адбываліся сутыкненні паміж урадавымі сіламі і баевікамі этнічных груповак, крыху палепшылася. «Аднак тайландскі бок па-ранейшаму ўважліва сочыць за развіццём сітуацыі, бо існуе высокая ступень нявызначанасці», — заявіў Пхалангкун.

### Казахстан напаўняе свае перасохлыя азёры паводкавай вадой з Расіі



Аб гэтым паведаміла прэс-служба Міністэрства водных рэсурсаў і ірыгацыі краіны. Заходне-Казахстанскі філіял «Казводгаса» накіраваў 30 мільёнаў кубаметраў паводкавай вады, якая паступіла з Расіі, у Камыш-Самарскія азёры вобласці. Пры гэтым у ведамстве адзначылі, што за апошнія 20 гадоў вада ў гэтыя азёры не паступала. Акрамя таго, спецыялісты «Казводгаса» маюць намер накіраваць паводкавую ваду ў прыродныя азёры Едылсар, Жалтырколь, Бірказан, Сарколь, Салтанат і іншыя вадаёмы, якія ў апошнія гады сутыкнуліся з высыханнем. Таксама праводзяцца падрыхтоўчыя работы па запуску Жанібекскай помпавай станцыі. Аб'ект перапампоўвае ваду, якая падаецца з Валгаградскай вобласці РФ, на тэрыторыю дзевяці сельскіх акруг Жанібекскага і Бакеёрдзінскага раёнаў Заходне-Казахстанскай вобласці. Сёлета планууецца падача 25,8 мільёна кубаметраў вады.

# ШТО ЗА ТАЕМНЫМІ ДЗВЯРЫМА?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Айцец Павел са сваімі малодшымі дзецьмі — Агнiяй і Кірылам — пасля рэпетыцыі спектакля.**

## Пра радасць, апору і дараванне

Пасля службы частка прыхаджан расходзіцца па дамах, астатнія ж — сярод іх **настаяцель храма протаіерэй Павел КІВОВІЧ** і трое з яго пяці дзяцей — спяшаюцца ў царкоўны дом «Ікас» на рэпетыцыю.

***— Айцец Павел, пагадзіцеся, далёка не кожны прыход можа пахваліцца ўласным тэатрам. На яго стварэнне неяк паўплывала тое, што ў вас самога пяць дзяцей?***

— Безумоўна. Свае дзеці — гэта апора. Яны мяне натхняюць, прымушаюць развівацца, гарэць, рухацца наперад. Усе пяцёра, без выключэння, прайшлі праз тэатр. Старэйшыя сыны — Данік і Дзіма — ужо адыгралі свае ролі, яны выраслі і жывуць асобна. Сярожу будзе 18 гадоў, ён, калі шчыра, не думаў удзельнічаць сёлета ў велікодным спектаклі, казаў: «Я ўжо дарослы». Але роля ката Базіліа вельмі падышла яму. І, як бачыце, Сяргей зноў на сцэне. Кіруша, яму ўсяго шэсць гадоў, сыграе ў спектаклі аднаго са Светлячкоў. Дачка Агнія пачынала з самых простых роляў — вавёркі, пчалы — і вось зусім нядаўна дарасла да галоўных: Марфушы, Маленькага прынца, у калядным спектаклі была Вослікам, у велікодным сыграе Бураціну. У нашага рэжысёра ад Бога Тацццяны Глебік ёсць здольнасць бачыць, каму якая роля найбольш падыходзіць.

— Агніі вельмі пасуе роля Бурацiны, бо яна сама, як агеньчык, стараецца не сумаваць і нясе радасць усім, — кажа Тацццяна Глебік. — Дарэчы, у Бібліі насамрэч адно з самых галоўных слоў, і бацюшка неаднаразова пра гэта казаў, — радасць. Трэба радавацца, нягледзячы ні на што. Нават калі вельмі балюча. Можна плакаць, што страціў блізкага, але лепш падзякаваць Богу, што ў тваім жыцці быў гэты чалавек, і радавацца гэтаму.

За год вясковыя акцёры паспяваюць падрыхтаваць два спектаклі. Паказваюць іх на вялікія царкоўныя святы — Нараджэнне Хрыстова і Вялікдзень. Самі атрымліваюць асалоду і дораць радасць іншым, хто адкладвае свае справы і спецыяльна прыязджае на прэм'еру нават з горада і іншых вёсак, запрашае сваіх родных.

— Кожная наша пастаноўка напоўнена глыбокім сэнсам. Знаёмая казка пераўвасабляецца і адкрываецца перад гледачамі ў іншым святле, — кажа айцец Павел. — Менавіта таму на ўсіх сваіх афішах мы пішам «пастаноўка па матывах «Залатога ключыка», «Маленькага прынца» і г. д. Проста паставіць спектакль, каб пазабаўляць гледачоў, — гэта не пра нас: сёння такога дастаткова. Мы з Тацццянай стараемся кожны сюжэт падаць з хрысціянскай пазіцыі, каб ён закранаў важныя чалавечыя каштоўнасці, чамусьці вучыў. Зусім нядаўна знайшоў словы Гогаля, што «тэатр — гэта такая кафедра, з якой можна шмат сказаць свету дабра». І злавіў сябе на думцы, што мы, нават не ведаючы гэтых слоў, менавіта такі сэнс у свой тэатр і ўкладвалі.

— Паставілі некалькі спектакляў па Андэрсену. Знайшлі ў яго казках шмат хрысціянскіх пастулатаў, якія ён паказаў, не гаворачы слова «Бог», — працягвае Тацццяна. — Напрыклад, у пастаноўцы «Дзікія лебедзі» пастараліся прадэманстраваць, як уплываюць словы, якія мы вымаўляем, на наша жыццё. Сказаў штосьці дрэннае — і ў цябе ў душы пасялілася жаба, добрае — і ў душы расквітнелі ружы. Пастаноўка «Залаты ключык, або Прыгоды Бурацiны» складаная тым, што хрысціянскія пастулаты не на самым паверсе, іх трэба шукаць. А калі знаходзіш, шчыра здзіўляешся: ого, гэта так можна было! Каб аблегчыць успрыманне, мы ўвялі ў спектакль новых герояў — Светлячкоў, якія тлумачаць важныя духоўныя прынцыпы — аб дараванні, аб любові. Напрыклад, ці ведалі вы, што словы «прости» і «просто» — аднакарэнныя? Калі хочаш, каб у цябе было проста, папрасі прабачэння, хочаш усё ўскладніць — пачні «разглагольствоваць»: хто мае рацыю, а хто вінаваты. Насамрэч часта гэта нават і не важна. У сцэне, дзе Бурацiна не хоча прасіць прабачэння ў Мальвіны, даецца практычная парада, як гэта зрабіць. Бо для многіх выбачыцца вельмі складана. А Светлячок кажа: «Трэба проста паглядзець чалавеку, якога ты пакрыўдзіў, у вочы і сказаць: «Прабач, калі ласка». — «Гэта так проста?» — здзіўляецца Бурацiна. — «Так проста. І на сэрцы адразу ж стане лёгка». Вось і атрымліваецца, што Светлячкі, якіх граюць чатыры хлопчыкі, будуць умець прасіць прабачэння. І, хто ведае, магчыма, гэты навык ім калі-небудзь у жыцці прыдасца. Яны вырастуць і ў нейкай сітуацыі ўспомняць словы са спектакля, бо паўтарылі іх сто разоў у гульнявой форме. А яшчэ тут уздымаецца пытанне безумоўнай Любові. «А Тата Карла мне прабачыць?» — пытаецца Бурацiна. Канечне, прабачыць, бо любіць.



**Падчас рэпетыцыі велікоднага спектакля па матывах казкі «Залаты ключык, або Прыгоды Бурацiны».**

***— Мне падалося, ці сапраўды ў вашым спектаклі Тата Карла выступае прататыпам Бога?***

— Калі вы гэта нават на рэпетыцыі заўважылі, значыць, мы на правільным шляху, — кажа святар. — Бо нават айцец Андрэй Ткачоў сказаў, што для яго «Прыгоды Бурацiны» — гэта прытча Хрыста аб блудным сыне.

— А Цвыркун вучыць, чым мы можам дапамагчы чалавеку, які далёка, які заблукаў, — дадае Тацццяна. — Ён кажа, што мы можам проста памаліцца пра яго. ...А яшчэ кожны раз прымяраеш на сябе ролі і пытаешся: а хто ты? Безумоўна, хочацца быць станоўчым героем. Але калі заўважаеш у сабе элементы Дурамара ці Карабаса-Барабаса, спрабуеш іх выправіць. То-бок, тэатр яшчэ дапамагае ўбачыць свае недахопы і працаваць над імі.

## Пра падтрымку, страх і покліч душы

А пачыналася ўсё з нядзельнай школы, якая з часам ператварылася ў студыю духоўна-эстэтычнага развіцця «Праменьчык».

— Мы з матушкай выхадцы з прыходу «Усіх тужлівых Радасць» Мінска — у той час там была самая вялікая нядзельная школа ў горадзе. Мы пазнаёміліся і выраслі ў царкоўнай маладзёжнай тусоўцы, пажаніліся. 25 гадоў таму мяне прызначылі настаяцелем у Старое Сяло. Безумоўна, мы перанеслі сюды досвед, які атрымалі ў мінскім храме, дзе часта паўтаралі, што ў любым прыходзе самае галоўнае — людзі. Таму мы стараемся, каб нашым прыхаджанам у царкве было ўтульна, як дома. І не толькі дарослым, але і іх дзецям: хацелася, каб яны таксама з задавальненнем прыходзілі сюды. Каб іх зацікавіць, адкрылі нядзельную школу. Акрамя ўрокаў па Законе Божым ёсць і творчыя заняткі. Вы ж самі бачылі, як ахвотна дзеці бягуць на рэпетыцыю. І гэта пры тым, што многія з іх прыйшлі з бацькамі на службу ў 8.30 (рэпетыцыя ж скончылася толькі ў 13.00. — **Аўт.**). Акрамя таго, мы штогод летам ладзім выпускны «Праменьчыка», прадумваем насычаную праграму і разам з дзецьмі і іх бацькамі выязджаем на прыроду.

— У першых пастаноўках удзельнічалі толькі дзеці, — згадвае бацюшка. — Але час паказаў, што іх адных недастаткова. У спектаклі ёсць ролі злыя, грахоўныя, якія дзіцяці іграць шкодна. А дарослы можа сыграць, і, у прынцыпе, гэта не прынясе яму шкоды, бо ён ведае ўжо, як з гэтым змагацца. Таму пачалі прыцягваць бацькоў. Спачатку гэта былі ценявыя спектаклі, дзе дарослыя кіравалі фігуркамі за кулісамі, пераадольвалі свой страх перад публікай. А потым паступова і яны пачалі выходзіць на сцэну.

Вось ужо больш за 10 гадоў нашы спектаклі ў якасці гледачоў наведваюць вучні і настаўнікі мясцовай Старасельскай школы. У нядзелю яны адзначаюць Вялікдзень у сваіх сем'ях, а ў панядзелак прыходзяць да нас. Мы ім паказваем спектакль, яны прыносяць свае творчыя нумары. Пасля гэтага ладзім сумесны салодкі стол, качаем яйкі з горкі, як гэта даўней рабілі ў вясковых сем'ях. Сябруем з мясцовай стайняй — нам выдзяляюць коней для катання. Развучваем беларускія народныя танцы. Ва ўсіх дзяцей ёсць магчымасць пазваніць у царкоўныя званы.

«Вучыцца трэба для таго, каб прачытаць галоўную кнігу — Біблію» — гэтая фраза неаднаразова гучыць у спектаклі.

— Разумнік без маральных прынцыпаў — страшны чалавек для свету. Таму ў Бурацiны ў руках — менавіта праваслаўная азбука, — кажа святар. — Да нас на прэм'еру прыходзяць у тым ліку і дзеці, якія не наведваюць царкву. Мы стараемся неназойліва расказаць ім пра хрысціянскія каштоўнасці, каб яны мелі шанц задумацца аб важных рэчах. Акрамя царквы, школьнікі наўрад ці яшчэ недзе гэта пачуюць.

...Звярнула ўвагу, што каля сцэны вісіць абраз, перад якім акцёры чытаюць малітву перад рэпетыцыяй.

— Дарэчы, сёлета ўпершыню абраз будзе ўдзельнічаць у пастаноўцы, — працягвае айцец Павел. — Напрыканцы спектакля за таемнымі дзвярыма, якія Бурацiна адчыніць залатым ключыкам, усе ўбачаць вялікую радасную велікодную ікону Уваскрэсення Хрыста. Гэта сімвал дарогі да Бога, шлях да выратавання кожнага з нас.

— Асабіста я адношуся да пакалення, якому зараз 45-50 гадоў, калі вера ў Бога была пад забаронай, і мы, дзеці таго часу, не ведалі, што там — за таемнымі дзвярыма, хоць нам вельмі хацелася туды трапіць, — кажа педагог, рэжысёр царкоўнага тэатра Тацццяна Глебік. — Многія дзеці і сёння хочуць трапіць у царкву, але бацькі не вядуць...

Тацццяна Глебік прызналася, што ў дзяцінстве марыла пра свой тэатр.

— Хоць царкоўны тэатр і не мой, але быць рэжысёрам у ім для мяне — пачэсная місія. Бо людзі тут не таму, што трэба, а па покліч душы.

У велікодным спектаклі задзейнічаны больш як 20 акцёраў. На сцэне можна ўбачыць ажно тры пакаленні. Так склалася, што практычна ўсе іграюць сем'ямі. Мама Дзіяна — П'еро, а яе сын — Светлячок, Каця — Мальвіна, яе сястрычка — жабка, а браты — Дурамар і Светлячок. У Таты Карлы дачушка выконвае ролю жабкі, а сястра Ксенія — Лісы Алісы. Самая шматлікая сям'я — Сотнікавых. «Мой муж дапамагае ў алтары, ён будзе Карабасам-Барабасам, сын Саша — Артэмон. Ірыне толькі тры гады, але ў яе ўжо першая важная роля — жабкі, — распавядае Наталля Сотнікава. — Хочаш выхаваць дзяцей добрымі людзьмі — пачні з сябе. Калі яны бачаць прыклад, разумеюць, што гэта важна для бацькоў, у іх з'яўляецца больш натхнення. Я па сваіх дзецях заўважыла, што яны не лянуюцца, з задавальненнем ідуць на рэпетыцыю, іх не трэба прымушаць». Сама Наталля рэдагуе сцэнарыі, робіць відэа і выстаўляе ў інтэрнэт. Яе маці — Юлія — на пару са Святланай, якая ў спектаклі іграе ролю Чарапахі Тарцілы, шыюць цудоўныя касцюмы пад кожную пастаноўку, ператвараючы спектаклі ў сапраўдныя касцюміраваныя шоу.

Усе пастаноўкі вяскоўцы рыхтуюць сваімі сіламі. Кожны робіць тое, што можа. Айцец Павел, хоць і мог бы выканаць любую ролю, бо вельмі артыстычны, у спектаклі адказвае за музычную частку. Акрамя таго, бацюшка збірае сцэну, пастаянна ўдасканальвае яе канструкцыю.

Пасля рэпетыцыі акцёры не спяшаюцца разыходзіцца па дамах, кожны прапаноўвае, як яшчэ можна ўпрыгожыць спектакль, залу. Хтосьці зробіць ачаг, хтосьці — залаты ключык. «А я яечак нараблю шмат», — кажа шасцігадовы Кіруша. — «Канешне, — усміхаецца айцец Павел, — вось тут *(паказвае на сцяну)* для іх шмат месца». У сучасным свеце, на жаль, бацькі ўсё менш і менш часу бавяць з дзецьмі, робяць штосьці разам. Наш тэатр выпраўляе гэту недарэчнасць, дапамагае яднанню сем'яў. Адна шматдзетная мама, якая ўдзельнічала ў спектаклі «Дзікія лебедзі», прызналася: «Час, які я правяла са сваімі дзецьмі на рэпетыцыях, — самыя шчаслівыя моманты года».

— Мой сын Ягор таксама шмат гадоў наведваў «Праменьчык», — кажа Тацццяна Глебік. — Ён іграе практычна ва ўсіх пастаноўках. Пачынаў з ролі Калабка ў велікоднай казцы. Сёлета ж, хоць у яго і выпускны клас, будзе Цвыркуном. Ад таго, што сын удзельнічае, і мне нашмат цікавей. Сёлета да нас далучылася і мая траюрадная пляменніца Ніначка, яна будзе іграць дзяўчынку з вялікім кашалком.

— Гэта так цудоўна, што ў нас пры царкве ёсць свой тэатр. Мы адно аднаго бачым падчас малітвы ў храме, ведаем у побыце. Але ж якія мы іншыя на сцэне! — кажа прыхаджанка Тацццяна з вёскі Хацежына. — Падрыхтоўка спектакля, рэпетыцыі вельмі яднаюць людзей. У нас у храме сямейная атмасфера, мы тут усе блізкія і родныя, падтрымліваем адно аднаго. Было б цудоўна стварыць відэаархіў нашых спектакляў, каб у любы момант можна было іх перагледзець. Не ў кожнага ж ёсць магчымасць прыехаць на прэм'еру. А хочацца, каб нашы светлыя і добрыя пастаноўкі паглядзела як мага больш людзей.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК,**
**фота аўтара.**

*Мінскі раён.*

# ПРЫПРАВЫ ЗАМЕСТ ВІТАМІНАЎ

## Галоўныя сакрэты шафрану і куркумы

**Спецыі калісьці былі даступныя толькі для багатых, але сёння перац, каляндра, карыца, кмен, куркума ёсць на кухні амаль у кожнай гаспадыні. Расказваем пра некаторыя з самых карысных і дарагіх прыпраў, якія дзякуючы вялікаму ўтрыманню антыаксідантаў дапамагаюць не толькі захоўваць маладосць, але і супрацьстаяць такім сур'ёзным хваробам, як рак і сардэчна-сасудзістыя захворванні.**

**Якая прыправа самая дарагая ў свеце і ці апраўдвае яна свой кошт? Пра гэта і іншае расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен ГАРБАННІДЖАД.**

— Калі казаць пра рэчывы, якія нас аб'ядноўваюць з далёкім мінулым, бо дайшлі ў нязменным выглядзе з часоў да нашай эры, то гэта прыправы. Некаторыя з іх выкарыстоўвалі ў Шумерскай цывілізацыі. Пра іх гаючыя ўласцівасці ведалі ў старажытныя часы. Спецыямі карыстаюцца цяпер і будуць ужываць у далейшым.

Адразу скажу: нягледзячы на тое што многія прыправы маюць сур'ёзныя лячэбныя ўласцівасці, імі цяпер не лечацца. Так, яны могуць прынесці карысць арганізму, але для лячэння ў XXI стагоддзі ёсць сучасныя лекі.

Цар усіх прыпраў — шафран. Гэта самая дарагая на нашай планеце спецыя. Кілаграм сапраўднага шафрану каштуе больш як пяць тысяч долараў. Ён выкарыстоўваецца ў дарагіх рэстаранах.

Радзіма шафрану — Індыя, Кітай і Кашмір. Найбуйнейшымі экспарцёрамі шафрану ў свеце сёння з'яўляюцца Іспанія і Іран. Першыя запісы пра шафран знойдзены ў Шумерскай цывілізацыі каля 2700 гадоў да нашай эры.

Ужо каля тысячы гадоў таму старажытныя ўрачы яго выкарыстоўвалі ў якасці лекаў. Авіцэна казаў, што шафран павялічвае патэнцыю, верагоднасць зацяжарыць, змяншае дрэнны настрой і засцерагае нашу печань, таксама заспакойвае нервовую сістэму і дае добры сон.

Шафран у перакладзе гучыць як «залатыя ніткі». Атрымліваюць спецыю з рыльцаў кветак шматгадовай расліны пад назвай «пурпурны крокус». Сабраны шафран знешне нагадвае скрутак зблытаных нітак, колер якіх вар'іруецца ад цёмна-чырвонага да чырвона-цаглянага. Водар прыправа мае ярка выяўлены з лёгкімі ноткамі свежаскошанага сена.

Высокі кошт на гэтую спецыю тлумачыцца не толькі працаёмкім працэсам вытворчасці, але і абмежаванымі аб'ёмамі сыравіны. У адным кілаграме шафрану — больш чым 200 тысяч рыльцаў крокусу. Пры гэтым у адной кветцы іх усяго тры. Рыльцы збіраюць уручную, пасля сушаць. Вырошчваць, даглядаць кветкі, уручную сабраць — гэта вялікая праца. З плантацыі ў гектар можна атрымаць не больш чым 8—12 кг гатовай прыправы.

***— Ці апраўдвае яна свой кошт?***

— Шафран з'яўляецца моцным антыаксідантам. З усіх спецый тут ён лідар. Як вядома, адна з прычын старэння клетак — свабодныя радыкалы. Дзякуючы антыаксідантам шафран аслабляе іх разбуральнае ўздзеянне і замаруджвае працэсы старэння.

Таксама ён валодае супрацьракавымі ўласцівасцямі. Лічыцца, што шафран змяншае хуткасць размнажэння атыповых клетак у арганізме. Ён не знішчае ракавыя клеткі, але замаруджвае іх рост. Таксама ён павялічвае мужчынскую моц. У сучасных таблетках, якія прызначаюць для павелічэння патэнцыі, у саставе часта сустракаецца шафран.



Куркума. Шафран.

Ён мае ў тым ліку і ўласцівасці антыдэпрэсантаў. Калі ўжываць невялікую колькасць шафрану, ён на кароткі час павышае настрой. Аднак трэба сказаць, калі з'есці некалькі грамаў такой спецыі, наступае перадазіроўка і гэта можа скончыцца смерцю.

***— Колькі шафрану можна бяспечна ўжываць у дзень?***

— Аптымальная доза — 30 міліграмаў, каб атрымаць тую карысць, аб якой мы казалі. Ва ўсходніх краінах шафран амаль штодзень выкарыстоўваецца ў розных стравах, і дэфіцыту яго няма. А ў еўрапейскіх краінах, ЗША гэта прыправа не так моцна распаўсюджана, але ён прадаецца ў капсулах. І ўрач дапаможа падабраць аптымальную дозу. Яго прызначаюць для ўмацавання імунітэту, павышэння патэнцыі, барацьбы са старэннем, прафілактыкі анкалагічных хвароб.

***— Якія віды раку папярэджвае шафран?***

— Зараз колькасць анкалагічных захворванняў расце. З дзесяці чалавек чатыры дакладна захварэюць на рак. Адзін з відаў анкалогіі, які моцна распаўсюджаны, у тым ліку ў ЗША, гэта рак тоўстага кішэчніка. Звязана тое з дрэннай якасцю ежы, ужываннем прадуктаў з вялікім утрыманнем цукру і фастфуду. Дык вось адначасова з лячэннем раку тоўстага кішэчніка прызначаюцца шафран у капсулах, ён да працэсу лячэння адносін не мае, але замаруджвае хуткасць росту пухліны ў тоўстым кішэчніку.

Таксама шафран мае добрыя ўласцівасці пры гінекалагічных хваробах. Увогуле раней на Усходзе жанчыны, якія мелі моцныя болі перад менструацыяй, ужывалі шафран, ён аблягчаў стан. І сёння ўсходнія жанчыны выкарыстоўваюць яго, хоць гэта нятанны сродак.

Акрамя таго, шафран мае аналагічныя ўласцівасці з кавай. Пах шафрану мае антыстрэсавыя і антыдэпрэсіўныя якасці. Ён актывізуе пэўныя ўчасткі ў галаўным мозгу, якія зніжаюць стрэс і аказваюць лёгкі антыдэпрэсіўны эфект. Кава мае падобныя ўласцівасці: калі мы чуем яе духмянасць, у нас таксама мяняецца настрой.

Лічыцца, што шафран паляпшае страваванне і карысны людзям, якія маюць праблемы са страўнікам. Некаторыя яго выкарыстоўваюць, каб зменшыць вагу. Наўпрост ён не мае ніякіх адносін для зніжэння вагі, але людзі, якія ўжываюць шафран у ежу, адзначаюць, што ў іх пачуццё сытасці наступае раней. Аднак гэтая ўласцівасць не ўніверсальная і не для ўсіх. У Амерыцы праводзіўся эксперымент, калі некалькім дзясяткам чалавек давалі таблеткі шафрану, але толькі некаторыя скінулі вагу і казалі, што пачуццё насычэння ў іх наступае хутка і есці не хочацца. Да таго ж пачуццё сытасці потым застаецца на больш працяглы час.

Як вядома, амаль чвэрць насельніцтва планеты пакутуе на сардэчна-сасудзістыя хваробы. Шафран змяншае колькасць халестэрыну і зніжае артэрыяльны ціск. Такім чынам ён абараняе сценкі сасудаў ад атэрасклератычных бляшак. Улічваючы, што пры зніжэнні артэрыяльнага ціску сэрцу лягчэй працаваць, можна сказаць, што шафран паляпшае кровазварот у арганізме і ў каранарных артэрыях.

Тры асноўныя сродкі, якія сучасная медыцына рэкамендуе для прафілактыкі хваробы Альцгеймера: куркума, вітамін D і шафран. Апошні — самы галоўны з іх.

***— Ці ёсць прыправа, блізкая па сваіх якасцях да шафрану і пры гэтым больш даступная?***

— Гэта куркума. Яна прыйшла з Індыі. Са старажытных часоў яна выкарыстоўвалася і ў Індыі, і ў Тайландзе, што пацвярджаецца старажытнымі запісамі. Толькі ў Сярэднявеччы яна дабралася да Еўропы. Паколькі шафран там быў вядомы сваімі карыснымі ўласцівасцямі даўно і яго выкарыстоўвалі ў медыцыне, то куркума, падобная яму па ўласцівасцях, атрымала назву «індыйскі шафран». Яна вырабляецца з кораня куркумы доўгай. Таксама выкарыстоўваецца ў сумесі прыправы кары.

Яна таксама валодае антыаксідантнымі ўласцівасцямі, хоць і ў меншай ступені, чым шафран.

У 1501 годзе партугальцы трапілі ў Індыю і, ацаніўшы смак індыйскай ежы з духмянымі пахамі, запоўнілі свае караблі куркумой, так яна трапіла ў Еўропу. У той час у Еўропе асноўнай прыправай была соль і, магчыма, перац, і па сучаснай смакавай шкале ежа была нясмачнай. Еўрапейцы навучыліся дадаваць куркуму ў свае стравы, бо зразумелі, што яна мяняе колер ежы, надае новы смак і водар.

На Усходзе яна дадаецца ў многія стравы, нават робяць чай з куркумы. У Еўропе яна не так шырока выкарыстоўваецца, таму еўрапейскі і амерыканскі варыянт — куркума ў таблетках, капсулах і ў якасці біядабавак.

Трэба сказаць, што ў Індыі і Кітаі куркуму выкарыстоўваюць як лекі ў альтэрнатыўнай медыцыне да цяперашняга часу. Лічыцца, што яна амаладжвае скуру, змяншае боль у суставах пры рэўматызме, паляпшае стан страўнікава-кішачнага тракту. Улічваючы, што куркума мае моцныя супрацьзапаленчыя ўласцівасці, яна змяншае працэс хранічнага запалення ў арганізме.

Куркума самастойна дрэнна засвойваецца, і яе карысныя ўласцівасці мінімальныя, калі не змешваць спецыю з чорным перцам. З гэтай прычыны ва ўсіх біядабаўках з куркумой ёсць чорны перац.

Куркумін, які ўтрымліваецца ў куркуме, добра актывізуе перадачу нервовых імпульсаў паміж аксонамі і ў сувязі з гэтым лічыцца добрым сродкам для прафілактыкі хваробы Альцгеймера. Паколькі яна мае моцныя супрацьзапаленчыя ўласцівасці, то змяншае запаленчы працэс у сценках сасудаў. Таму людзі, які пастаянна ўжываюць куркуму, маюць больш здаровыя сасуды. Як і шафран, яна спрыяе здароўю каранарных артэрый.

***— Ці замаруджвае яна, як і шафран, рост ракавых клетак?***

— Так. Урачы пакуль не могуць адназначна сказаць, што яна неяк уплывае на лячэнне раку тоўстага кішэчніка, але з вялікай упэўненасцю сцвярджаюць, што спрыяе замаруджванню росту некаторых атыповых клетак. Таксама куркума станоўча дзейнічае пры лячэнні артрозу і артрыту, мае антыдэпрэсіўныя ўласцівасці і замаруджвае працэсы старэння.

Штодзённа можна ўжываць ад 500 да 2000 міліграмаў гэтай спецыі. Звычайна прызначаецца 600 міліграмаў тры разы на дзень. Аднак ёсць індывідуальная генетычная непераносць куркумы. Людзі з ёй не могуць ужываць больш чым 1000 міліграмаў куркумы ў суткі. Яна выклікае моцнае ўздуцце жывата і боль у эпігастральнай вобласці. Такім людзям непажадана яе ўжываць нават у звычайнай дозе. Адзінага меркавання ў медыкаў наконт ужывання куркумы цяжарнымі жанчынамі няма, таму ім лепш параіцца з урачом.

*Пра дзве іншыя не менш карысныя прыправы — карыцу і каенскі перац — чытайце ў бліжэйшых нумарах «Звязды».*

**Алена КРАВЕЦ.**

---

Навінкі кнігавыдання

# Восеньскія лісты паэта...

**Віктара Шніпа, якога добра ведаюць як паэта, усё часцей уважлівы чытач беларускай літаратуры адкрывае і як празаіка. У Выдавецкім доме "Звязда" толькі што пабачыў працяг «дзённікавы раман паэта» — «Заўтра была адліга-4».**




У кнізе аб'яднаны запісы пісьменніка ад сярэдзіны жніўня 2018 года да кастрычніка 2019 года. Лічы, восенню пачатая і восенню ж завершаная справаздача творцы аб пройдзеным шляху, аб прачытаных кнігах, аб сустрэчах і адкрыццях... Віктар Шніп кліча за сабою чытача, каб агледзець зробленае і разам выказаць перажыванні аб няздзейсненым. Паэт і празаік, мастак слова не проста дзеліцца і не проста разважае, ён імкнецца паяднаць прастору і час, выступае лірычным героем твора, ды і нас, чытачоў, у нейкай ступені ўцягвае ў сваю і мастацкую рэчаіснасць.

«15.08.2018. Дні заўважна пакарацелі. Праўда, я не бачыў іх доўгімі. Дні былі дажджлівымі. Былі спякотнымі. Былі сумнымі. А доўгіх для мяне не было. Дні прыходзілі і сыходзілі. Як марскія прылівы і адлівы. І перад мною ўжо ляжыць жоўтая лістота, як пясок...»

Часам здаецца, што паэт піша некаму лісты. Піша, быццам імкнецца перадаць не толькі ўсё самім перажытае, але і заклікае чытача да развагі пра яго сны, пра колеры, а не толькі пра сутнасць думак. Амаль што эпіцэнтрам усяго дзённікавага рамана з'яўляецца вёска, што не проста віртуальна прысутнічае на старонках «Адлігі», а якая і нам прыадкрываецца ўсімі сваімі сімваламі і вобразамі. Чытаючы старонкі Віктара Шніпа пра яго родныя Пугачы, не можаш не думаць і пра сваю родную вёску...

*«29.12.2018. <...> ...робячы падрахунак пражытага за 2018 год, пачну з кепскага:*

*Вельмі мала быў у родных Пугачах.*

*Памерла некалькі аднавяскоўцаў, з якімі хацеў у гэтым годзе сустрэцца і пагаварыць, але не сустрэўся...*

*Мала казаў добрых слоў родным і знаёмым...*

*Не ўсім змог дапамагчы, каму трэба было дапамагчы...*

*Не адведаў многіх родных. Асабліва шкадую, што не быў у Лягезах, дзе гадаваўся да школы сем гадоў...» «01.01.2019. На маёй Валожыншчыне цэлы дзень ідзе снег. Месцамі завеі. У Лягезах вуліца замецена. У Пугачах не вельмі снегу, але мяце. У Татарах завея. У Ракаве снежна. Лёня Шчарбінскі, які жыве з жонкай каля Валожына ў вёсцы, дзе цяпер тры жыхары, два разы выходзіў і расчышчаў сцяжыну да вуліцы, па якой зімой амаль не ездзяць машыны. І па сцяжыне сёння ніхто да Шчарбінскіх не прыходзіў і не прыйдзе, але Лёня яшчэ раз перад сном выйдзе і расчысціць снег...» «30.01.2019. З Навасёлак патэлефанаваў дзядзька Леанід Жыткевіч. Паведаміў непрыемную навіну. У мінулую нядзелю ў Дубравах згарэла хата паэта Вячаслава Міхасёнка, які ўжо шмат гадоў, як памёр. У хаце жыў вясковец, які таксама згарэў. Хата адметная не толькі тым, што там жыў паэт, але і тым, што ў ёй неадназова гасцяваў Уладзімір Караткевіч. Некалькі гадоў таму мы з Леанідам Жыткевічам і Міхасём Казлоўскім хадзілі глядзець хату. Памятаю, як Міхась казаў: «Добра было б трапіць на гарышча. Там павінны быць б быць кніжкі Караткевіча з аўтографамі...» Не паглядзелі, бо нікога дома не было. Цяпер ужо ніколі не паглядзім. Ад хаты засталося абвугленае бярвенне...» «14.05.2019. Збіраюся ў вёску, як на планету, з якой даўным-даўно перасяліўся сюды, дзе асфальт і бетон і дзе ўжо зацвілі каштаны, якія для мяне не сталі роднымі...»*

Так што найперш раю прачытаць кнігу Віктара Шніпа вяскоўцам, тым, хто і ў горадзе пачувае сябе сапраўдным грамадзянінам вёскі.

А набыць «дзённікавы раман паэта» «Заўтра была адліга-4» можна ва ўсіх кнігарнях ААТ «Белкніга» — у розных абласцях Беларусі, а таксама ў Мінску ў кнігарні «Акадэмкніга» па адрасе: праспект Незалежнасці, 72. Прыемных чытацкіх падарожжаў, прыемных сустрэч са словамі і думкамі Віктара Шніпа!

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
## по продаже пустующего жилого дома в частную собственность в д. Горбовщина, д. 10 Крайского сельисполкома Логойского района Минской области

| | |
|---|---|
| Форма проведения аукциона | Открытый |
| Наименование предмета аукциона | Жилой дом |
| Дата, время и место проведения аукциона | **05 июня 2024 года в 15.00,** аг. Крайск, ул. Буденного, д. 8, Крайский сельисполком, зал заседаний |
| Продавец и его адрес, телефоны | Крайский сельский исполнительный комитет, 223138, Минская область, Логойский район, аг. Крайск, ул. Буденного, д. 8, тел.: 1774-73-6-35;1774-73-6-36; А1 44 5990948 |
| Местонахождение имущества | Минская область, Логойский район, д. Горбовщина, 10 |
| Общая площадь жилых помещений | 52,7 кв. м |
| Жилая площадь | 47,3 кв. м |
| Описание имущества | Одноэтажный одноквартирный жилой дом, материал стен – бревно, крыша – шифер, отопление печное. Водопровод, канализация, газоснабжение отсутствуют. Электроснабжение центральное |
| Условия аукциона по продаже пустующих домовладений | Возместить затраты, связанные с публикацией извещения в средствах массовой информации в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. рублей | 40,00 |
| Сумма задатка и реквизиты продавца | 20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, **8,00 руб.** Получатель – Крайский сельисполком, BY21AKBB36006191611010000000, ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, г. Логойск, ул. Пролетарская, д. 1, УНП 600537220, код платежа 04707 |
| Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения (без учета стоимости размещения извещения о проведении аукциона), бел. руб. | Объявление в газету |
| Адрес земельного участка | Минская область, Логойский район, д. Горбовщина, 10 |
| Площадь земельного участка | 0,1187 га |
| Целевое назначение земельного участка | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Дата начала приема документов | С даты объявления аукциона |
| Окончательный срок приема документов | 30 мая 2024 года до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021года № 844 п. 1, на основании решения Крайского сельского исполнительного комитета.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Для участия в аукционе предоставляются:

- заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:
- копия платежного поручения о внесении суммы задатка;
- гражданин предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов на участие в аукционе заключается СОГЛАШЕНИЕ о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с Крайским сельским исполнительным комитетом.

Осмотр пустующего дома осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, **обязан:**

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, внести плату за предмет аукциона;
- подать заявление о предоставлении земельного участка.

После принятия соответствующего решения – обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды – заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией.

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЧЕТВЕРТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЧУП «Дебиторка Проф», 213811, г. Бобруйск, а/я 16** |
| Продавец | **ООО «Бобруйская оптовая база», Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 185-5** |
| **Предмет аукциона** | |

**Капитальное строение: ХОЛОДИЛЬНИК С КАМЕРАМИ ХРАНЕНИЯ**
(здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) с инв. № 710/С-56649, общ. пл. 2908 кв. м. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, 187Б

_Составные части и принадлежности:_ (рампа с навесом, инв. № 513; ворота секционные подъемные «Pro Trend» 1800/3200 ADS 703РБ инв. № 360; ворота секционные подъемные «Pro Trend» 2600/2550 ADS 703РБ, инв. № 361; газопровод (газоснабжение изолированного помещения склада холодильника, г. Бобруйск, ул. Гоголя, 187Б, инв. № 548)).
_Земельный участок,_ общ. пл. 1,1715 га, предоставлен продавцу для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения (участок № 1) на праве постоянного пользования.
_В состав лота_ входит иное имущество (компрессор BITZER Ecolane 4NES-14Y-40P; система видеонаблюдения (наружная) склад, ул. Гоголя, 187Б; система видеонаблюдения (внутри склада), ул. Гоголя, 187Б; система охранно-пожарной сигнализации (ул. Гоголя, 187Б)

**Начальная цена без НДС 632 476,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 31 623,80 бел. рублей**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00. Ответственное лицо: Артем Петрович, тел. +375 29-111-47-27

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется в р/с BY32ALFA30122770590010270000 в ЗАО «Альфа Банк», г. Бобруйск; БИК ALFABY2X; УНП 791239428; получатель платежа – ЧУП «Дебиторка проф»

**Срок подписания договора купли-продажи: 20** (двадцать) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: 20** (двадцать) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи

